Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

ЛІПЕНЬ 26 1932 г. № 166 (4418).

Год выданьня XV

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Сеньня у нумары

АБ ПЕРАБУДОВЕ РАБОТЫ І АРГАНІЗАЦЫЙНЫХ ФОРМ ПРАМКААПЭРАЦЫІ—Пастанова ЦВК і СНК СССР (1 стар.).

ДА ЎСІХ КРАЯВЫХ, АБЛАСНЫХ ПАРТЫЙНЫХ КАМІТЭТАЎ, ЦК НАЦЫЯНАЛЬНЫХ РЭСПУБЛІК І ЎСІХ РАЁННЫХ ПАРТЫЙНЫХ КАМІТЭТАЎ (1 стар.).

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ—Да юбілею «Зьвязды». **М. Мазуркевіч**—Да вынікаў другой канфэрэнцыі камсамолу Заходняй Беларусі (2 стар.). **Э. ЛЬВОЎСКІ**—Выступленьні польскага дзяржаўнага тэатру Украіны (3 стар.).

Зьберажэм сотні тысяч цэнтнэраў збожжа (1 стар.).

Практычнае ажыцьцяўленьне пастаноў ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б—першачарговая задача кожнай нізавой парторганізацыі (2 стар.).

Бытавыя ўмовы рабочых на бабруйскім камбінаце—«вузкае месца» ў рабоце заводзкіх арганізацый (3 стар.).

ЛІСТЫ РАБСЕЛЬКОРАЎ (3 стар.).

Кампартыя Германіі заклікае да ўсеагульнай забастоўкі (4 стар.).

Жорсткая расправа польскага фашызму над украінскімі селянамі (4 стар.).

Да юбілею „Зьвязды"

Праз 13 дзён—9 жніўня — ПЯТНАЦЦАЦІГОДЗЬДЗЕ «ЗЬВЯЗДЫ». Пятнаццаць год назад ва ўмовах жорсткай рэакцыі буржуазна-памешчыцкага часовага ўраду вышаў першы нумар «Зьвязды».

Гісторыя нашага бальшавіцкага друку—гэта гісторыя слаўнай гераічнай барацьбы партыі за дыктатуру пралетарыяту, за сацыялізм. Гісторыя «Зьвязды»—гэта гісторыя барацьбы КП(б)Б за перамогу пралетарскай рэвалюцыі, за Савецкую Сацыялістычную Беларусь. На ўсіх этапах, пры ўсякай абстаноўцы, у глыбокім падпольлі і па барыкадах у кастрычніцкія дні, у барацьбе з інтэрвэнтамі і на рыштаваньнях пераможнай сацыялістычнай будоўлі бальшавіцкі друк заўсёды быў «самай вострай, самай моцнай зброяй партыі» (І. Сталін).

Іменна таму буржуазія заўсёды з такой дзікай, зьвярынай нянавісьцю прасьледвала друк нашай партыі. Іменна таму крывавы буржуазны тэрор заўсёды быў асабліва жорсткім і бязьлітасным да бальшавіцкіх газэт. І ня толькі тады. І цяпер буржуазія, прыкрываючыся славутай так званай «свабодай друку» у капіталістычных краінах шалёна цкуе і заганяе ў глыбокае падпольле рэвалюцыйны друк.

Часовы ўрад адразу ўлічыў пасьля першага-ж нумару «Зьвязды», якім небясьпечным і сьмяротным ворагам зьяўляецца яна для буржуазна-памешчыцкай рэакцыі. Генэрал Балуеў у сваім рапарце на імя галоўнакамандуючага Заходнім фронтам у свой час з жахам і дзікай злобай пісаў, што «Зьвязда»... «абвясьціла бязьлітасную вайну буржуазіі, памешчыкам і капіталістам. Кожны яе нумар — гэта суцэльны заклік да гвалту над гэтымі клясамі пасель ніцтва. Хадайнічаю аб закрыцьці вышэйпаказанай газэты з рэквізыцыяй друкарні, якая яе друкуе». Пасьпела выйсьці толькі 17-нумароў «Зьвязды». Спэцыяльным загадам ваеннага міністра часовага ўраду «Зьвязда» была закрыта. Охранка ўшчэнт разграміла друкарню «Зьвязды». Набор 18-га нумару зьніщылі на радкох.

Тэрор не дапамог. Наша партыя і рабочыя масы змаглі адстаяць сваю газэту. «Зьвязда» выйшла пад назвай «Молат», прычым тыраж яе рос, літаральна, не па днёх, а па гадзінах. З заводаў і фабрык, з акопаў ад салдацкіх мас у рэдакцыю прабіваліся праз паліцэйскія кардоны сотні і тысячы лістоў, прасякнутых гневам і нянавісьцю да часовага ўраду, аддадасьцю—да партыі, брацкай любоўю—да сваёй газэты, рэвалюцыйнай гатоўнасьцю да барацьбы. З шэрых старонак «Зьвязды», ня гледзячы на тэрор, на правакацыі і меншавіцкае цкаваньне, заўсёды чыстомна гучэў магутны заклік нашай партыі да мас змагацца за справу пралетарскай рэвалюцыі.

9-га жніўня спаўняецца ня толькі пятнаццаць год са дня выхаду першага нумару «Зьвязды». **ПРАЗ 13 ДЗЁН — ПЯТАЯ ГАДАВІНА ПЕРАВОДУ «ЗЬВЯЗДЫ» НА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ.** Гэты юбілей—яркая і слаўная перамога ленінскай нацыянальнай палітыкі, якая цьвёрда і ..аўхільна праводзіцца ў жыцьцё нашай партыяй. Ён зьяўляецца дэманстрацыяй тых гістарычных заваяваньняў, якіх дасягнула наша партыя пад бальшавіцкім кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) на чале з тав. Сталіным і ЦК КП(б)Б у барацьбе за будаўніцтва нацыянальнай пралетарскай культуры, за ленінскую нацыянальную палітыку.

Дзьве даты. Два юбілеі. Які гігантскі пераможны прароблен шлях! Які скачок наперад, да сацыялізму, да бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва ад царскага ўціску, потым чорнай рэакцыі Керанскіны, крывавага разгулу інтэрвэнтаў і іх нацыянал-дэмакратычных лёкаяў, кайданаў белапольскай акупацыі, ад голаду і разрухі пакінутых нам контр-рэвалюцыяй.

БССР, як і ўвесь Савецкі саюз, канчатково замацавалася на сацыялістычным шляху. Мільёны рабочых і работніц, калгаснікаў з магутным творчым энтузіязмам будуюць сацыялізм пад кіраўніцтвам партыі Леніна. Мы стаім на крутым уздыме, на шляху далейшага росту, у той час, як увесь капіталістычны сьвет усё глыбей і глыбей коціцца ў бяздонье эканамічнага крызісу.

Бурны рост сацыялістычнай індустрыі за бясьпечыў бальшавіцкі ўздым усіх галін нашай народнай гаспадаркі.

Ад дробнай саматужнай прамысловасьці, з яе невялікімі заводзікамі і рамонтнымі майстэрнямі даваеннага часу,—да бурна растучай лёгкай і цяжкай прамысловасьці з новымі гігантскімі заводамі, узброенымі перадавой тэхнікай, з камбінатамі, новымі электрастанцыямі, з разгорнутым усё ўзрастаючым капітальным будаўніцтвам;

—ад дробных сялянскіх гаспадарак, якія задыхался ў ціскох бязьмежнай памешчыцкай і кулацкай эксплёатацыі,—да саўгасаў і калгасаў, машына-трактарных станцый, да буйнага сацыялістычнага зямляробства, да пасьпяховага і пасьлядоўнага ажыцьцяўленьня палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы на аснове суцэльнай калектывізацыі;

— ад нянісьменнай адсталай краіны царскай імпэрыі—да рэспублікі суцэльнай пісьменнасьці, да пераможнага будаўніцтва нацыянальнай пралетарскай культуры, — такавы нашы шляхі, такавы нашы тэмпы, тэмпы разгорнутага сацыялістычнага наступленьня. Іх партыя забясьпечыла ў барацьбе за ленінізм у тэорыі і на практыцы, супроць апартунізму ўсіх масьцей і адценьняў і асабліва супроць галоўнай небясьпекі на даным этапе—правага ўхілу, за ленінскую нацыянальную палітыку.

Партыя заўсёды на ўсіх этапах сваёй барацьбы за пралетарскую рэвалюцыю і будаўніцтва сацыялізму, пад ленінскім кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, пільна ахоўвала чыстату і непарушнасьць сваёй генэральнай лініі. Партыя ў адкрытым баі зруйнавала контр-рэвалюцыйны трацкізм і разграміла правую апазыцыю, якая капітулявала перад капіталістычнымі элемэнтамі. Наша партыя з жалезнай непрымірымасьцю змагаецца супроць усякіх ухілаў у нацыянальным пытаньні, асабліва супроць ухілу да вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі.

У гэтым, у ленінскай згуртаванасьці нашай партыі вакол ЦК УсеКП(б) і тав. Сталіна, у яе непахіснай барацьбе з апартунізмам, у яе непарыўнай і глыбокай сувязі з масамі—аснова посьпехаў сацыялістычнай будоўлі, аснова перамог пяцігодкі.

Бальшавіцкі друк — верны дапаможнік партыі ў барацьбе за адзінства і згуртаванасьць яе радоў. Спэцыфічная асабліваасьць нашага друку іменна і заключаецца ў яго непрымірымасьці да ўсякіх адхіленьняў ад генэральнай лініі партыі, да ўсякіх ухілаў у нацыянальным пытаньні, у тым, што ён зьяўляецца самым верным і ленінным сродкам штодзённай сувязі партыі з рабочымі і калгаснымі масамі. Паглядзеце, якім бурным тэмпам расьце армія рабселькораў, расьце непасрэдны жывы ўдзел мас у рабоце нашага друку!

«Зьвязда», як і ўвесь бальшавіцкі друк з першых дзён, і тады ў дні падпольля і кастрычніцкіх баёў, і цяпер, у перыяд разгорнутага наступленьня сацыялізму па ўсім фронце, ні на крок не адступіла ад традыцый бальшавізму, непрымірыма змагаючыся на два фронты супроць апартуністаў і прымірэнцаў, за ленінскую партыйнасьць, за чыстату і адзінства бальшавіцкіх радоў.

«Зьвязда» заўсёды ішла ў авангардзе барацьбы пад кіраўніцтвам КП(б)Б за ленінскую нацыянальную палітыку. Успомнім, з якой шаленай энэргіяй, з якой дзікай, безшабашнай злобай вялі сваё змаганьне супроць «Зьвязды» контр-рэвалюцыйныя беларускія нацдэмы і вялікадзяржаўныя шавіністы. А гэта значыць, што нашы ўдары пападалі ў цэль, што «Зьвязда» моцна біла і б'е па ворагах партыі, па ворагах ленінскай нацыянальнасьці.

У нашай рабоце былі і памылкі. Ёсьць і **зараз** пэўныя недахопы, промахі, прабелы. «Зьвязда» ў 1929 г. дала няправільны лёзунг у галіне нацыянальнага пытаньня, які трактаваў нацыянал-дэмакратызм, як галоўную небясьпеку. Пазьней у 1931 г. мы дапусьцілі «лявацкае» ігнараваньне арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Гэтыя памылкі «Зьвязда» пры дапамозе і пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б), ЦО—«Правды» і Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б выправіла. Нельга не адзначыць таксама і тых недахопаў, якія ёсьць у нашай рабоце ў галіне непасрэднай работы з масамі і, **асабліва,** у барацьбе за рэалізацыю 6 умоў тав. Сталіна, за тэмпы і якасьць работы прамысловасьці БССР. Разгортваючы барацьбу за канкрэтную, апэрацыйную перабудову сваёй работы ў адпаведнасьці з новымі ўмовамі, новай абстаноўкай сацыялістычнага будаўніцтва, мы прымем усе меры, каб гэтыя недахопы, гэтыя прабелы ў бліжэйшы час поўнасьцю ліквідаваць. **ГАЛОЎНАЕ** заключаецца ў тым, каб рашуча ўзмацніць непасрэдную сувязь з масамі, каб глыбей, канкрэтней, шчыльней зьвязацца з заводамі, калгасамі, саўгасамі, МТС і забясьпечыць яшчэ больш ўдзел мас у нашай практычнай рабоце, каб па-бальшавіцку разгортваць самакрытыку.

Юбілей на парозе. Самай лепшай адзнакай пятнаццацігодзьдзя «Зьвязды» і пяцігоздзьдзя пераводу яе на беларускую мову будзе бальшавіцкае ўзмацненьне барацьбы за практычную рэалізацыю пастаноў аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б, за новы далейшы ўздым нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

Справа гонару кожнага заводу, кожнай фабрыкі—**даць больш прадукцыі і лепшай якасьці, па-баявому разгарнуць выпуск тавараў шырокага спажываньня.**

Справа гонару кожнага саўгасу, калгасу і МТС—**сваячасова і бяз страт убраць ураджай, хутка і добра правесьці збожжаза гатоўкі, шырэй разгарнуць калгасны гандаль.**

Справа гонару кожнай партыйнай ячэйкі—**яшчэ больш узмацніць барацьбу за беларусізацыю, за будаўніцтва культуры, нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па сваім зьмесьце, за ленінскую нацыянальную палітыку.**

Наперад да новых перамог! Пад кіраўніцтвам партыі Леніна вышэй тэмпы будаўніцтва сацыялізму, шырэй фронт барацьбы за пабудову бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва!

Аб перабудове работы і арганізацыйных форм прамкаапэрацыі

Пастанова ЦВК і СНК СССР

У мэтах далейшага разгортваньня вытворчай ініцыятывы прамысловай арцелі, а таксама для максымальнага пашырэньня прамысловай каапэрацыяй вырабу прадметаў шырокага спажываньня, — Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў Саюзу ССР лічаць неабходным правесьці наступныя мерапрыемствы:

1. Па загатоўцы сырцу і матар'ялаў вытворчасьці

а) Прадаставіць прамкаапэрацыі права бесьперашкоднай паўсюднай загатоўкі для патрэб сваёй вытворчасьці розных відаў сырцу, за выключэньнем бавоўны, ільну, пянькі, воўны, шаўковых каконаў і скуры.

ЗАЎВАГА: У кожным паасобным выпадку загатоўка бавоўны, ільну, пянькі, воўны, шаўковых каконаў і скуры можа быць дазволена асобнай пастановай камітэту па загатоўках пры СНА шляхам адводу для загатовак прамкаапэрацыі адпаведных раёнаў.

Загатоўка сьвіных скур дазволена ўсюды

б) Дазволіць прамысловай каапэрацыі паўсюдную загатоўку ўсякага роду ўцілю, адыходаў і адкідаў;

в) прадаставіць прамысловай каапэрацыі (арцель, саюз) права закупкі на дзяржаўных прадпрыемствах (фабрыках, заводах) адыходаў (мэталь, тэкстыльныя адыходы, пыматкі, брак, лясныя адыходы), годных для пераапрацоўкі, шляхам заключэньня спэцыяльных дагавораў як з трэстамі, так і з заводамі, кіраўніцтвамі.

2. Па збыту

а) Устанавіць, што арцель (таварыства) мае права непасрэднага продажу вырабленай ёю прадукцыі з сырцу сваёй загатоўкі, на рынках, базарах, а таксама дзяржаўным і каапэрацыйным арганізацыям;

б) скасаваць сыстэму цэнтралізаваных абавязковых заказаў. Замест гэтага ўстанавіць, што дзяржаўныя і каапэрацыйныя арганізацыі і прадпрыемствы здаюць свае заказы, якія вырабляюцца з сырцу, які даецца, або непасрэдна прамыслова - каапэрацыйным арцелям, або праз яднаючыя іх саюзы ў парадку добраахвотнай, двухбаковай гаспадарчай згоды;

в) прадукцыя, якая вырабляецца арцельлю (таварыствам) для шырокага рынку з сырцу, які адпускаецца з дзяржаўных фондаў, прадаецца арцельлю або саюзам адпаведным дзяржаўным або каапэрацыйным гандлюючым арганізацыям.

ЗАЎВАГА: У мэтах стымуляваньня больш пасьпяховага і хуткага выкананьня заказаў прамарцелямі, дзяржаўныя або каапэрацыйныя гандлюючыя арганізацыі пры заключэньні дагавораў з арцелямі могуць прадугледжваць некаторы процант прадукцыі, які застаўляецца ў распараджэньне дапай арцелі для продажу па яе ўгледжаньні.

3. Аб цэнах на прадукцыю прамкаапэрацыі

Устанавіць, што: а) тавары шырокага спажываньня, якія вырабляюцца прамкаапэратывамі з сырцу, што набываецца ў парадку самазагатовак, рэалізуюцца імі па цэнах, якія складаюцца на рынку. У магазынах саюзаў прамкаапэрацыі тавары рэалізуюцца таксама, як і ў магазынах калгасных аб'яднаньняў (па цэнах ня вышэй сярэдніх - камэрцыйных);

б) цэны на прадукцыю, якая вырабляецца прамкаапэрацыяй у парадку заказу для дзяржаўных і каапэрацыйных арганізацый з сырцу, які адпускаецца прамкаапэрацыі па дзяржаўных цэнах, устанаўліваюцца ў парадку дагавораў з заказчыкамі;

в) цэны на прадукцыю, што вырабляецца прамкаапэрацыяй з сырцу, які адпускаецца ў плянавым парадку, устанаўліваюцца камітэтам тавараных фондаў і рэгуляваньня гандлю пры СНА або, па яго даручэньні, адпаведнымі наркаматамі

4. Аб фінансах і крэдыце прамкаапэрацыі

а) Арцель (таварыства) самастойна распараджаецца ўласнымі зваротнымі сродкамі і маемасьцю;

б) банкаўскі крэдыт у дэцэнтралізаваным парадку адкрываецца мясцовым філіялам банку непасрэдна арцелі, таварыству, або саюзу;

в) скасаваць практыку абавязковых адлічэньняў як на ўтрыманьне вышэйстаячых зьвеньняў, так і на ўсякага роду культурныя і агульна - каапэрацыйныя мерапрыемствы. Разьмер адлічэньняў на ўтрыманьне апарату вышэйстаячых зьвеньняў і ўсе агульна - каапэрацыйныя расходы вызначаюцца сходам упаўнаважаных ад арцеляй і саюзаў

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет народных Камісараў Саюзу ССР ставяць перад арганізацыямі саматужна - прамысловай каапэрацыі ў якасьці адзей з важнейшых задач давядзеньне ўсіх гэтых адлічэньняў да мінімуму.

Усе вышэйстаячыя зьвеньні прамкаапэрацыі абавязаны рабіць справаздачу перад нэрыфэрыяй прамысловай каапэрацыі ня толькі на гадавых зьездах і сходах, але і ў парадку штомесячных і паўгадовых справаздач;

г) дапусьціць авансаваньне прамкаапэратываў з боку заказчыкаў (дзяржпрамысловасьці, дзяржгандляў і каапэрацыі), якое праводзіцца пад кантролем банку.

5. Аб арганізацыйнай пабудове сыстэмы прамысловай каапэрацыі

а) Устанавіць, што першапачатковым каапэрацыйным зьвяном прамысловай каапэрацыі зьяўляецца арцель, вытворчае, або збыта - снабжэнцкае таварыства;

б) другім апэрацыйным зьвяном зьяўляецца міжраённы гнездавы, або абласны спэцыялізаваны саюз.

На саюз усякладаецца арганізацыйнае і гаспадарчае абслугоўваньне каапэрацыйнай пізоўкі (снабжэньне інструментамі, сырцом, даламожнымі матар' яламі), а таксама прадстаўніцтва пізоўкі перад дзяржаўнымі арганізацыямі;

в) у саюзных рэспубліках (акрамя РСФСР) і абласьцях з шырока разьвітымі саматужнымі промысламі ствараюцца прамкаапэрацыйныя саветы (без апэрацыйна - гаспадарчых функцый), у абавязак якіх уваходзіць аргработа, улік, пэрспэктыўнае плянаваньне і прадстаўніцтва прамысловай каапэрацыі ў мясцовых і цэнтральных савецкіх органах;

г) за ўсесаюзным саветам прамысловай каапэрацыі, які разам з тым выконвае функцыі савету прамысловай каапэрацыі РСФСР, захаваць арганізацыйную работу, улік, дырэктыўнае і пэрспэктыўнае плянаваньне і прадстаўніцтва прамысловай каапэрацыі перад саюзнымі ўрадавымі арганізацыямі (па крэдытаваньні, па фондах снабжэньня, па абароне прадстаўленых прамкаапэрацыі законах правоў і г. д.).

Устанавіць, што прамкаапсавет СССР і РСФСР ніякіх апэрацыйных функцый не маюе;

д) ліквідаваць усесаапхарчпрамсаюз, цяжпрамсаюз, усесаапграмсаюз і іх галінавыя аб'яднаньні. Захаваць усесаюзнае аб'яднаньне лясной прамкаапэрацыі — усесаапграмлессаюз (без стварэньня рэспубліканскіх яго аб'яднаньняў) і рэспубліканскія аб'яднаньні мэталёвай саматужнай прамысловасьці — мэталяпрамсаюзы;

е) лічыць бязумоўна недапушчальным стварэньне пры абласных прамкаапэрацыйных саветах і ўсесаюзным савеце прамысловай каапэрацыі грамоздкага апарату з сэктарамі па спэцыяльных відах прамкаапэрацыі, дапусьціўшы арганізацыю ў апараце ўсесаапрамсавету спэцыялізаваных груп па асноўных відах прамкаапэрацыі. Устанавіць, што вышэйуказаныя саветы павінны мець невялікія апараты, якія забясьпечваюць выкананьне ўскладзеных на іх функцый;

ж) абавязаць усесаапрамсавет правесьці рэарганізацыю сыстэмы прамысловай каапэрацыі ў месячны тэрмін.

6.

а) ЦВК і СНК Саюзу ССР абавязваюць мясцовыя арганізацыі і кіруючыя органы прамкаапэрацыі прыняць меры да выкараненьня прыватнікаў і спэкулянтаў-перакупшчыкаў прадукцыі саматужнай прамысловасьці, вядучы рашучую барацьбу з праяўленьнямі спэкуляцыі ў паасобных прамкаапэрацыйных зьвеньнях;

б) ЦВК і СНК Саюзу ССР абавязваюць саматужна-прамысловую каапэрацыю аказваць усялякую садзейнасьць некаапэраваным саматужнікам як у парадку спаўкэньня іх матар'яламі, так і ў дапамозе ў збыце іх тавараў, ужываючы авансаваньне і заключэньне доўгатэрміновых дагавораў з імі;

в) ЦВК і СНК Саюзу ССР лічаць, што асноўнай вытворчасьцю саматужна - прамысловай каапэрацыі павінны быць тавары шырокага спажываньня. Прапанаваць мясцовым арганізацыям і кіруючым органам прамкаапэрацыі плянаваць вытворчасьць саматужна - прамысловай каапэрацыі такім чынам, каб забясьпечыць у першую чаргу выраб тавараў шырокага спажываньня з тым, каб у 1933 годзе ўдзельная вага тавараў шырокага спажываньня была даведзена да 70 проц. усёй прадукцыі прамкаапэрацыі, маючы пры гэтым на ўвазе асобнае рэгуляваньне вясковага асартымэнту;

г) зьвярнуць увагу як кіруючых органаў прамысловай каапэрацыі, так і Народнага камісарыяту замежнага гандлю па неабходнасьць асаблівага стымуляваньня разьвіцьця экспартных артыкулаў;

д) абавязаць кіруючыя органы саматужна - прамысловай каапэрацыі і адпаведныя наркаматы забясьпечыць таксама выраб прадметаў культурнага ўжытку (навучальныя падручнікі і інш.), хірургічных і мэдычных інструментаў, інструментаў, неабходных для работы самой прамкаапэрацыі, дзіцячых цацак і г. д.;

е) абавязаць кіруючыя каапэрацыйныя органы ўвесьці ў практыку работы саматужна-прамысловай каапэрацыі ўзаемнае самаабслугоўваньне ўнутры - каапэрацыйных зьвеньняў.

7.

Даручыць СНК СССР і ўрадам саюзных рэспублік у двухмесячны тэрмін прывесьці законадаўства Саюзу ССР і саюзных рэспублік у адпаведнасьць з гэтай пастановай.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР — М. КАЛІНІН.

Старшыня Савету Народных Камісараў Саюзу ССР — В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР — А. ЕНУКІДЗЭ.

ДА ЎСІХ КРАЯВЫХ І АБЛАСНЫХ ПАРТЫЙНЫХ КАМІТЭТАЎ, ЦК НАЦЫЯНАЛЬНЫХ РЭСПУБЛІК І ЎСІХ РАЁННЫХ ПАРТЫЙНЫХ КАМІТЭТАЎ

ЦК УсеКП(б) прапануе ўсім партыйным арганізацыям забясьпечыць няўхільнае і поўнае ажыцьцяўленьне пастаноў ЦВК і СНК СССР ад 23 ліпеня аб прамысловай каапэрацыі. Намечаныя ЦВК і СНК СССР мерапрыемствы па разгортваньні вытворчай ініцыятывы прамысловай арцелі і таварыства маюць буйнейшае значэньне для далейшага росту вырабу тавараў шырокага спажываньня для гораду і вёскі.

ЦК УсеКП(б) прапануе ўсім партарганізацыям:

1) Прыняць актыўны ўдзел у перабудове работы органаў прамысловай каапэрацыі, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на апэрацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне арцелі і таварыства.

2) Разгарнуць вакол пастановы ЦВК і СНК неабходную масава-растлумачальную работу і забясьпечыць штодзённы кантроль за ходам выкананьня гэтай пастановы.

3) Умацаваць сыстэму прамысловай каапэрацыі, асабліва ў сярэднім яе зьвяне, адпаведнымі кадрамі.

ЦК УсеКП(б).

ЗЬБЕРАЖЭМ СОТНІ ТЫСЯЧ ЦЭНТНЭРАЎ ЗБОЖЖА

КОЖНУЮ КАЛГАСНУЮ БРЫГАДУ ЎЗБРОІЦЬ ДАСКАНАЛЫМ ПЛЯНАМ БАРАЦЬБЫ СА СТРАТАМІ

Барацьба са стратамі не арганізавана

Лёзна. (Наш кар.).

Жыта і раньні ячмень пасьпяваюць разам з ільном. Наступае самы напружаны момант уборачнай кампаніі.

20 і 21 ліпеня пачалі цераблеьне раньняга ільну і жніво калгасы «**Апора саветаў**» (Лёзьнянскі сельсавет), «**Новы шлях**» і **імя Варашылава** (Лунаўскі сельсавет). Разгортваецца масавае жніво ў Кабыліцкім сельсавеце. Праз 2-3 дні ўвесь раён пачне масавую ўборку жыта, ільну і інш. культур.

Практыка першых дзён уборкі паказвае, што некаторыя калгасы ня досыць падрыхтаваны да правядзеньня яе ў найкарацейшыя тэрміны, бяз страт. Не ва ўсіх калгасах, брыгадах і бядняцка-сераднцкіх вёсках прапрацаваны пастановы СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб уборачнай кампаніі, пастановы ЦВК і СНК аб рэвалюцыйнай законнасьці і пастановы аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б.

У радзе выпадкаў клясава-варожы элемэнт, які пралез у калгасы, імкнецца пасвойму тлумачыць гэтыя пастановы. Напрыклад, у калгасе «**Праўда**», Лунаўскага сельсавету, заможнікі пачалі «тлумачыць» пастановы партыі і ўраду рашэй чым партыйная ячэйка.

Па іхнаму (па - кулацку) выходзіць, што «клясавая барацьба спыняецца, ня будзе, моў, больш кулакоў, цьвёрдазаданьнікаў, спыняецца калектывізацыя»...

Пад уплывам кулацкай агітацыі, у некаторых калгасах беднякі прабавалі падаваць заявы аб выхадзе з калгасу, але пасьля правядзенай палітычна-растлумачальнай работы забралі заявы назад. Вылучены кулакі і заможнікі, якія вялі шкодніцкую работу.

Кулак і яго агентура імкнецца сарваць уборку, ім трэба панесьці руйнуючы ўдар яшчэ больш арганізацыйна-гаспадарчым зацаваньнем калгасаў і правільнай арганізацыяй калгаснай вытворчасьці.

Між тым у радзе калгасаў арганізацыя працы кульгае. Напрыклад, у калгасе «**Апора саветаў**», які яднае 45 гаспадарак, усе працуюць «скокам», няма вытворчых вучасткаў і брыгад. Гэта дрэнна адбіваецца на рабоце.

З пачаткам цераблеьня ільну жанчыны самі, паміма праўленьня разбіліся на дробныя вытворчыя групы, самі вызначылі вучасткі ільну, выклікалі адна другую па сацыялістычнае спаборніцтва. Тое-ж на жніве. Ад групы жанчын 15 чал. вылучыліся 2 дзяўчыны, якія працуюць асобна. Яны заяўляюць, што хочуць перавыканаць норму, а ў вялікай брыгадзе гэтага амаль нельга зрабіць. Праўленьне-ж калгасу цягнецца ў хвасьце і не падхапіла ініцыятывы саміх мас калгасьнікаў.

Добры прыклад арганізацыі працы на ўборцы паказвае калгас імя Варашылава. Тут захаван пастаянны склад брыгад. Кожная брыгада мае выразныя заданьні. Сілы брыгады разьбіты на дробныя групы, работа якіх улічваецца і ацэньваецца асобна. Там, дзе прада ідзе дробнымі вытворчымі групамі, наглядаецца акуратны выхад на работу, няма прагулаў.

Нездавальняюча ідзе работа ў маленькіх калгасах. Напрыклад, у калгасе «**Чырвонаармеец**», які яднае толькі 8 гаспадарак, у тым ліку 3 заможныя. Тут заможнікі перашкаджаюць працаваць беднякам. Бедняк-калгасьнік **Сідорскі**, акуратна і рана выходзіць на работу. Заможнікі — **Якубенка, Сахараў і Барадульскі** кпяць з яго:

— Глядзі, актывіст пашоў, яму больш трэба.

Нарэшце, райкалгасаюз і МТС незабясьпечылі калгасы штодзённай дапамогай, апэрацыйным кіраўніцтвам. Калгасам не даны ўказаньні, як рабіць зерняўлавіцелі. Іх толькі зараз яшчэ зьбіраюцца рабіць, а ўборка ўжо пачалася.

Барацьба са стратамі належным чынам не арганізавана. У гэтым галоўны недахоп падрыхтоўкі да ўборачнай.

А. Мінуцці.

20 тысяч рублёў эканоміі пусьцілі на вецер

Цяжка хістаецца ад лёгкага ветру буйны колас шырокіх лаў калгаснага жыта.

— Сёлета ўраджай азімны выпэй сярэднятага,—з гонарам гаворыць Пухавіцкі райзграном тав. **Васкабоіч.**

З задаволенай усмыхкай гаворыць пра добры ўраджай азімых і калгасьнікі з «Авангарду» і камунары «Зьвязды».

— Будзе хлеб, трэба яго толькі хутчэй убраць.

Зерняўлавіцелі... Пра іх пачулі сёлета ў раёне ўпяршыню. Спачатку ўзяліся за справу з энтузіязмам, падлічылі што прыстасаваньне зерняўлавіцеляў да 157 жнівярак можа даць 21 тыс. руб. эканоміі на ўборцы толькі адных азімых.

Але замест мабілізацыі на гэту справу актыўнасьці ўсёй калгаснай масы, у Пухавічах парашылі зрабіць зерняўлавіцелі ў цэнтралізаваным парадку і далі заказ райкамбінату. Каб ня было абязьлічні, адказным за гэту справу выучылі дырэктара райкамбінату тав. **Бондалётава.**

Апошні, відавочна, належыць да тэй калегорыі людзей, якія лічаць, што «справа ня воўк, у лес не ўцячэ».

Калі праз некалькі дзён у Бандалётава запыталі, што з зерняўлавіцелямі, ён адказаў: «Няма чарцякоў, няма ўзораў, ня ведаем, як рабіць».

— Узоры, чарцяжы, калі ласка, вось яны ёсьць у райзга, атрымайце заказ на 200 шт.

Бандалётаў прысеў ад нечаканасьці. Але тут-жа заенчыў:

— Дошак няма, сеткі няма.

Пасьля паўторнага націску райзга, Бандалётаў знайшоў дошкі і паставіў на выкананьне сьпешнага заказу... аднаго столяра.

* * *

Высьпеў буйны колас. Наліўся залатым зярнём. Жмуць ужо жыта і ў камуне «Зьвязда» і ў калгасах «Авангард» і «Новае Ляцно». 60 проц. жыта Балоцкага сельсавету ўжо ў мэнцліках.

А зерняўлавіцелі?..

— За дзень зраблю адзін зерняўлавіцель,—паведамляе столяр.

— Няўжо іх не маглі зрабіць самі калгасы і саўгасы?—пытае ён.—Работа простая, а то пакуль мы тут зробім, дык ня то што жыта, але і авёс пажнуць.

Да 23 ліпеня замест 200 зерняўлавіцеляў зроблена толькі 20 і то ў «асноўным». Іх яшчэ трэба аказаць, прыладзіць сетку Бандалётаў толькі зараз пачаў шукаць жалеза і рабочых.

А там, на саўгасных і калгасных палёх сотні цэнтнэраў зерня сыпываюць са сталоў жнівярак на зямлю. 21 тыс. руб. эканоміі ад зерняўлавіцеляў, якія падлічыў райзграном, разьляцелася па ветры. Гэта ў Пухавічах—буйнейшым раёне, дзе ёсьць дзесяткі спэцыялістаў, аграномаў, дзе ёсьць Мар'інаторскі тэхнікум.

Нінель.

Пачалі жніво не падрыхтаванымі

КАПЫЛЬ. (Наш кар.). Першыя дні жніва паказалі, што рад калгасаў выйшлі на ўборку азімых непадрыхтаванымі. У калгасе «**Рэвалюцыя**», напрыклад, няма плану ўборкі, жнівярні не адрамонтаваны, таксама як і гумны для складаньня і малацьбы збожжа.

У радзе калгасаў, як імя Калініна, «Шлях Леніна» і інш. зусім няма жнівярак. У той-жа час суседнія калгасы маюць па 3 і па 5 жнівярак, уборачная-ж плошча адпадае. Райкалгасаюз выявіў колькасьць жнівярак у калгасах і лічыць, што яго ясна на гэтым скончана.

Апарат райкалгасаюзу і МТС не мабілізаваны на барацьбу са стратамі. Трактарныя малатарні стаяць яшчэ на складах МТС неправеранымі. Плямы мазьцьбы яшчэ не складзены. Кіраўніцтва уборкай ідзе паволі.

ПЕРШЫ ЧЫРВОНЫ АБОЗ СА ЗБОЖЖАМ НОВАГА УРАДЖАЮ

ЖЫТКАВІЧЫ (Па тэлеграфу).

Перадавыя калгасы Жыткавіцкага раёну 24 ліпеня чырвоным абозам здалі дзяржаве першыя 3 тоны збожжа новага ўраджаю.

Загадчык райзга—**Буйнаў**

Старшыня райкалгасаюзу—**Багданаў**

Дырэктар МТС—**Тоўстых**

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Практычнае ажыцьцяўленьне пастаноў ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б—першачарговая задача кожнай нізавой партарганізацыі

Справа гонару кожнай парт'ячэйкі

Рашэньні аб'яднанага ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б — баявая і канкрэтная праграма работы на значны адрэзак часу для кожнай нізавой партарганізацыі БССР. Выканаць тыя мерапрыемствы, якія вызначаны гэтымі рашэньнямі — значыць пасьпяхова ажыцьцявіць дырэктывы партыі на рашаючых участках народнай гаспадаркі Савецкай Беларусі, ударна з мінімальнымі стратамі правесьці ўборку ўраджаю, у тэрмін і поўнасьцю закончыць цэнтралізаваныя загатоўкі, разгарнуць выраб тавараў шырокага спажываньня, арганізаваць калгасны гандаль.

Справа гонару кожнай партыйнай ячэйкі, яе першачарговая задача — шырока папулярызаваць пастановы пленуму як унутры арганізацыі, так і сярод шырокіх працоўных мас, мабілізаваць іх на практычнае ажыцьцяўленьне гэтых пастаноў.

За час пасьля скліканьня пленуму значная частка нізавых, асабліва вытворчых арганізацый КП(б)Б мае ўжо некаторыя посьпехі ў распрацоўцы пастаноў пленуму, у справе практычнага іх ажыцьцяўленьня.

ПАСТАНОВЫ ЗАМАЦОЎВАЮЦЬ СПРАВАЙ

Партыйны калектыў чырвонасьцяжнага заводу «Бальшавік» зараз-жа пасьля скліканьня аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б шырока разгарнуў работу па распрацоўцы яго пастаноў сярод камуністаў, камсамольцаў і беспартыйных рабочых.

На заводзе праведзен спэцыяльны палітдзень, прысьвечаны папулярызацыі пастаноў пленуму. Гэтыя пастановы, акрамя таго, абгавораны на агульным сходзе партыйнага калектыву, а таксама на сходзе старых рабочых-ударнікаў і зьлёце рабкораў.

На агульным партыйным сходзе ў спрэчках па дакладу тав. Галадзеда аб выніках ліпеньскага пленуму прыняла актыўны ўдзел значная частка радавых членаў і кандыдатаў партыі.

У рэзалюцыі па дакладу тав. Галадзеда агульны сход памеціў рад канкрэтных мерапрыемстваў па ажыцьцяўленьні пастаноў пленуму. У гэтым напрамку на заводзе ўжо ёсьць некаторыя дасягненьні. Арганізавана на аснове скарыстаньня адкідаў вытворчасьці цэх выпрацоўкі тавараў шырокага спажываньня. Вытворчым планам гэтага цэху за 3-ці квартал прадугледжана выпрацоўка прадукцыі на 17.800 руб. Зараз перад партыйнай арганізацыяй і заводакіраўніцтвам стаіць задача — ліквідаваць тыя недахопы, якія маюць месца ў справе ўкамплектаваньня ўцільцэху рабочай сілай.

Дырэкцыя заводу арганізавала нараду ад міністрацыйна-тэхнічнага персаналу ўсіх цэхаў, на якой абгаворана пытаньне аб выпрацоўцы тавараў шырокага спажываньня і максымальным скарыстаньні адкідаў вытворчасьці.

Акрамя таго, па ўсіх цэхах заводу ў мэтах максымальнай папулярызацыі сярод рабочых пастаноў пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б, а таксама практычных мерапрыемстваў, якія намечаны па заводзе ў сувязі з пастановамі пленуму, былі праведзены гутаркі. На заводзе абвешчан агульна-заводзкі конкурс на лепшую распрацоўку і практычнае ажыцьцяўленьне пастаноў ліпеньскага пленуму. Заводакіраўніцтвам вылучан для гэтага конкурсу прэміяльны фонд у 250 руб.

Рабочы калектыў заводу «Бальшавік» выклікаў на спаборніцтва ў напрамку мабілізацыі рацыяналізатарскай думкі па скарыстаньні адкідаў вытворчасьці Менскую абутковую фабрыку.

У мэтах паляпшэньня масавай работы на прадпрыемстве, пры партыйным калектыве арганізуюцца курсы групартаргаў і брыгадных агітатараў-прапагандыстаў.

Шамес, Норкін.

Пры актыўным удзеле беспартыйных рабочых ударнікаў

Распрацоўка пастаноў ліпеньскага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б на Бабруйскім дрэвапрацоўчым камбінаце распачалася абгаворэньнем гэтага пытаньня на бюро парткому, а потым на агульным сходзе партарганізацыі камбінату. На гэтым сходзе, акрамя камуністаў, актыўны ўдзел прымалі і беспартыйныя рабочыя.

Выступаўшыя ў спрэчках з усёй выразнасьцю падкрэсьлівалі, што пастановы пленуму зьяўляюцца разгорнутай праграмай работы ўсёй КП(б)Б, праграмай, выкананьне якой забясьпечвае ажыцьцяўленьне задач на рашаючых участках сацыялістычнага будаўніцтва БССР.

Асаблівую ўвагу партыйная арганізацыя камбінату аддала пытаньням разгортваньня вырабу тавараў шырокага спажываньня. Наводле дарэчэньня сходу, бюро парткому вылучыла некалькі камуністаў, якія адказваюць за наладжаньне гэтай работы на прадпрыемстве. Ужо да гэтага часу такая пастаноўка працы дала пэўныя вынікі: знач на пашырэн асартымэнт вырабаў уцільцэху.

Нельга прайсьці міма таго, што на заводзе яшчэ ня зусім добра наладжана прасоўваньне тавараў шырокага спажываньня на калгасны рынак. Гэта тлумачыцца тым, што некаторыя гандлёвыя арганізацыі Бабруйску — ЦРК, спажыўсаюз, а таксама аддзел збыту і ЗРК лесазкамбінату яўна недаацэньваюць гэтай справы. На складзе камбінату больш двух тысяч ляжыць 1.000 табурэтак, між тым ніхто ня прымае мер для таго, каб рэалізаваць іх, каб вывезьці іх на рынак.

Глыбокая прапрацоўка пастаноў пленуму на дрэвапрацоўчым камбінаце зьяўляецца вынікам таго, што асноўная частка партыйных ячэек гэтага прадпрыемства забясьпечыла добрую і сыстэматычную падрыхтоўку і правядзеньне партыйных дзён, эпэрацыйна кіравала работай партыйных груп, аказвала канкрэтную дапамогу групартаргам і таварам.

Г. Н.

Гарадзкія і вясковыя ячэйкі Магілеўшчыны глыбока распрацоўваюць пастановы пленуму

Партарганізацыя Магілеўскага раёну шырока разгарнула работу па распрацоўцы пастаноў аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б. 15 ліпеня райкомам праведзена нарада сакратароў партыйных калектываў і ячэек, на якой абмеркавана пытаньне аб формах і мэтадах папулярызацыі пастаноў пленуму.

Нарадай вызначан адзіны партыйны дзень для гарадзкіх і вясковых партыйных ячэек, у які кожная нізавая партарганізацыя павінна праводзіць у сябе прапрацоўку пастаноў ліпеньскага пленуму.

У мэтах забясьпячэньня пасьпяховага правядзеньня гэтай работы ў вясковых ячэйках, на дапамогу ім паслана 27 чалавек з ліку раённага партактыву.

Партыйны калектыў шаўковай фабрыкі ўжо разгарнуў шырокую масавую работу сярод рабочых фабрыкі з мэтай максымальнага прыцягненьня іх да ўдзелу ў распрацоўцы пастаноў пленуму. Партыйныя ячэйкі гэтага калектыву праводзяць па гэтым пытаньні адкрытыя сходы ў цэхах.

Зусім недапушчальны зьяўляецца тое, што ва ўсёй гэтай работе вельмі нізначны ўдзел прымае раённы Дом Камуністычнай Асьветы. Яго кіраўнікі ня лічаць патрэбным арганізаваць мэтадычную дапамогу і кансультацыю рабочым прапагандыстам, дапамагчы ім глыбока прапрацаваць пастановы пленуму ў сваіх ячэйках.

Прахарэнка.

Па Менскіх вытворчых партарганізацыях

* На заводзе Імя Молатава пастановы аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б распрацаваны толькі на агульным партыйным сходзе арганізацыі заводу. Зараз агіткалектывам заводу праводзіцца падрыхтоўка да распрацоўкі пастаноў пленуму ў нізавых зьвеньнях вытворчасьці.

Парткі раўніцтва заводу Імя Молатава павінна зьвярнуць асаблівую ўвагу на тое, каб работа па прапрацоўцы пастаноў пленуму ў цэхах праходзіла пад знакам вызначэньня канкрэтных мерапрыемстваў па дапамозе падшэфным калгасам, па разгортваньні вырабаў тавараў шырокага спажываньня, па перабудове партыйна-масавай работы па-новаму.

* Партарганізацыя заводу „Ударнік" яшчэ да гэтага часу не пачала распрацоўкі пастаноў аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б. Гэта пытаньне нават не абмяркоўвалася на бюро партыйнага калектыву.

Неадкладная задача бюро—зараз-жа разгарнуць работу па давядзеньні да кожнага члена партыі, кандыдата, камсамольца і беспартыйнага рабочага пастаноў аб'яднанага пленуму. Трэба ўзяць раўненьне на партыйную арганізацыю заводу „Бальшавік", дзе ёсьць узорныя паказальнікі ў гэтым напрамку.

* На фабрыцы Імя 8 сакавіка агульны сход партыйнага калектыву прапрацаваў пастановы ліпеньскага пленуму яшчэ 16 ліпеня. Сход вызначыў рад практычных мерапрыемстваў па перабудове партыйна-масавай работы і арганізацыі вырабу тавараў шырокага спажываньня. На фабрыцы некалькі дзён таму назад адкрыт уцільцэх па скарыстаньні адкідаў вытворчасьці.

Зараз партыйны калектыў рыхтуецца да прапрацоўкі пастаноў пленуму ў палітгуртках, цэхавых ячэйках і на нарадах групарторгаў.

* На заводзе „Камунар" разгортваецца прапрацоўка пастаноў пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б у палітшколах і цэхавых ячэйках. У бліжэйшыя дні гэта пытаньне будзе абмеркавана на агульным сходзе партколектыву.

Пастановы пленуму распрацаваны на сходзе дэлегатак. У працэсе прапрацоўкі па ініцыятыве камуністаў і беспартыйных рабочых прынята рад рашэньняў аб адкрыцьці ўцільцэху.

„Асьвейская законнасьць"

(„Ленінскі шлях", Асьвея)

У Асьвеі паранылі, што статут с.-г. арцелі патрабуе, так сказаць, некаторых карэктываў. У прыватнасьці, тут захацелі адным росчэркам пера ператварыць арцель у камуну. «Карэктывы» уносіліся з бурным «лявацкім» энтузіязмам. У калгасах Асьвейскага і інш. сельсаветаў перш за ўсё абагулілі ўсіх кароў. Стараннымі перагібшчыкамі ні з чым не жадалі лічыцца. Раз карова—значыць троба абагуліць. Па прынцыпу гэтай ура-«лявацкай» устаноўчай ў цэлым радзе калгасаў былі абагулены ўсе тыя кароты, якія згодна статуту с.-г. арцелі павінны знаходзіцца ў асабістым карыстаньні калгаснікаў.

Гэтыя факты на рэдакцыю раённай газэты «Ленінскі шлях» не зрабілі, літаральна, ніякага ўражаньня. Ня думайце, што газэта выкрывала апартуністаў, рашуча патрабавала выпраўленьня дапушчаных памылак. Толькі ня тэта. У раёне беспакарана дапускаюцца трубныя «лявацкія» загібы, апартуністы, ахопленыя адміністратарскім запалам, адкрыта праводзяць сваю кулацкую работу, а рэдакцыя?.. РЭДАКЦЫЯ МАЎЧЫЦЬ, ЯК ВАДЫ Ў РОТ НАБРАЎШЫ. Газэта ня бачыць, што робіцца пад носам. У газэце—ні слова, ні намёку на сапраўднае становішча ў раёне. Праходзіць месяц, два—маўчаньне газэты не парушаецца. Рэдакцыя робіць від, што ўсё ў парадку і няма ніякай патрэбы пісаць аб нейкіх перагібах.

Пры ўсякім зручным выпадку газэта сьпяшаецца загадзя ўмыць рукі і зьняць з сябе ўсякую адказнасьць. Між іншым так паступаць, відавочна, любіць і раённы камітэт КП(б)Б. Барацьбу з кулацтвам, напрыклад, райком, як і рэдакцыя газэты, вялікадушна даручае... толькі аднаму раённаму пракурору. 3-га чэрвеня «Ленінскі шлях» у сваёй перадавой пісаў, што кулацтва актыўна імкнецца сарваць веснавую сяўбу. Тут-жа газэта ставіць пытаньне:

«...Што зрабілі сельсаветы і ячэйкі, каб зламаць супраціўленьне кулацкіх элемэнтаў?» («Л. Ш.» № 30).

Далей сьледуе адказ:

«...ПАКУЛЬ ШТО НІЧОГА. У выніку бязьдзейнасьці сельсаветаў і ячэек, РК і РВК БЫЛІ ВЫМУШАНЫ ПРАПАНАВАЦЬ ЗАНЯЦЦА ГЭТАЙ СПРАВАЙ ПРАКУРОРУ. Мы лічым, што пракурор павінен заняцца і справай выяўленьня хто патурае кулацка-заможным элемэнтам».

Нішто сабе вывады! Ну, а райком, рэдакцыя газэты, у чым-жа іх абавязкі?

Такая тактыка газэты. Яна або маўчыць, штампуючы правую практыку і «лявацкія» перагібы ў раёне, або бездапаможна крычыць—параўн, ганьбіць усе сельсаветы і ячэйкі, не называючы ні аднаго канкрэтнага посьбіта зла.

Больш за ўсё рэдакцыя, аднак, любіць маўчаць. Матар'ялы з Асьвейскага раёну сьвідчаць, што тут практыка перагібаў яшчэ і да гэтага часу не ліквідавана. У раёне масавая работа падмяняецца скрозь і ўсюды толькі «лявацкім» адміністраваньнем. Пасобныя сельсаветы захапляюцца масавымі штрафамі і нават вобыскамі, груба парушаючы рэвалюцыйную законнасьць. Аб усіх гэтых фактах «Л. Ш.» да самага апошняга часу зусім ня пісаў. Мы прагледзілі камплекты газэты за сакавік-ліпень. І што-ж? У газэце—цішыня, мёртвы, нешарушны спакой. На старонках «Л. Ш.» да самага апошняга часу ня было ні адной заметкі, нават ні аднаго радка аб фактах парушэньня рэвалюцыйнай законнасьці ў раёне, ні намёку на выпадкі адміністратарскага самадурства пасобных сельсаветаў.

Шыла ў мяшку, аднак, не схаваеш. Не змагла схаваць яго і рэдакцыя «Л. Ш.». У адным з апошніх нумароў газэты раптоўна зьяўляецца вялікі падвальны артыкул «Рэвалюцыйная законнасьць і не правільнае сельсаветамі Асьвейшчыны». У артыкуле нечакана падаюцца самыя забойчыя факты. Проста не артыкул, а цэлая калекцыя абвінавачых матар'ялаў. Аказваецца, у раёне становішча зусім не такое, якім прадстаўляла яго ўвесь час рэдакцыя газэты. Але ня думайце, што ў газэты нарэшце разьвязався язык і яна загаварыла поўным голасам. Дарэмная надзея. Нічога новага па сутнасьці і не адбылося. Тон, тактыка газэты, яе лінія і ў гэтым артыкуле такія-ж, як і раней.

З самага пачатку рэдакцыя, мякка кажучы, пачынае блытаць. «Л. Ш.» сьпяшаецца перш за ўсё запэўніць, што ён цьвёрда стаіць за адзіную рэвалюцыйную законнасьць. Ня вытрымаў, аднак, небарака і прагаварыўся. Запэўніў, запэўніў, але так і не запэўніў. Рэдакцыя разам з аўтарам артыкулу манэўруюць. Адзіная рэвалюцыйная законнасьць для Асьвеі па сутнасьці ня так ужо і... патрэбна. Навошта? Можна і без яе абыйсьціся. У Асьвеі ёсьць, аказваецца, свая «асьвейская законнасьць» (?!) Ня верыце? Дарэмна. Паслухайце лепш, што прапавядуе рэдакцыя «Л. Ш.»:

«...У АСЬВЕЙШЧЫНЕ на 15-м годзе Кастрычніцкай рэвалюцыі можна часта бачыць законнасьць не агульнасаюзную, або АСЬВЕЙСКУЮ, а наадварот: Сенькаўскую, Савейкаўскую, Кісялёўскую і г. д. Гэта значыць, што ў кожным сельсавеце ёсьць свая «ўласная законнасьць». («Л. Ш.» № 35).

Ужо сама па сабе гэта «асьвейская законнасьць» прымушае настаражыцца. Людзі, як бачыце, адкрыта шкадуюць, што так званая «асьвейская законнасьць» не заняла яшчэ сабе абсалютнай манаполіі ў раёне. Відавочна, гэта «законнасьць» заключаецца ў тым, каб старанна штампаваць на прыкладу газэты перагібы і скажэньні партыйнай лініі.

«У калгасах Асьвейскага і Задзежынскага сельсаветаў,—піша далей «Ленінскі шлях»,—пры абагуленьні буйнай рагатай жывёлы АБАГУЛІЛІ АПОШНІХ КАРОЎ. Цяпер, калі тыя ці іншыя калгаснікі пераходзяць у другі калгас, або ў тым выпадку, калі праўільна і няправільна выключаюцца з калгасу, ім праўільнае калгасу АДМАЎЛЯЕ Ў ВЫДАЧЫ КАРОВЫ. Сельсаветы на гэта НЕ РЭАГУЮЦЬ І НЯ ВЫПРАЎЛЯЮЦЬ допушчаных пры абагуленьні «лявацкіх» перагібаў, а гэтым самым ня выконваюць рэвалюцыйнай законнасьці.

Ёсьць выпадкі, калі АДБІРАЮЦЬ У калгаснікаў пад калгасны пасеў гарод... МОЖНА БЫЛО ПАДАЦЬ ЯШЧЭ ЦЭЛЫ РАД ФАКТАЎ ПАРУШЭНЬНЯ РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ ЗАКОННАСЬЦІ, АЛЕ І ПАДАНЫХ ДАВОЛІ».

«Але і паданых даволі»—вось вывад газэты. Вось у чым заключаецца і ўся яе барацьба з перагібамі. Рэдакцыя акуратна фіксуе факты, або, як яна піша, выпадкі парушэньня рэвалюцыйнай законнасьці. Балі-ж ёй гэта, з дазволу сказаць, справа дакучае, яна паўтарае пудную стэрэатыпную фразу:

«...такіх выпадкаў парушэньня рэвалюцыйнай законнасьці можна падаць цэлыя сотні» (?)

Хочаце—падам яшчэ фактаў, ня хочаце—ня троба,—пяча сваю бескарысную балбатню рэдакцыя газэты. На большае яна ісьці ня хоча і толькі ў канцы артыкулу ціха, мімаходам піша:

«Трэба сказаць, што факты парушэньня рэвалюцыйнай законнасьці сустракаюцца НЯ ТОЛЬКІ ў тых сельсаветах, якія былі вышэй названы, але і ў радзе іншых сельсаветаў і РАЁННЫХ УСТАНОЎ».

Якія гэта ўстановы, газэта так і не сказала. Што і гаварыць, скромнасьці ў рэдакцыі багата. Толькі, ці скромнасьць гэта? Не. Гэта прыміраньства, махровае, бясспрынцыпнае прыміраньства да правай практыкі і «левага» апартунізму, дрэнна завуаліраваная лёкайская спроба ня трывожыць апартуністаў з раённага кіраўніцтва. Што і гаварыць, калі газэта НАВАТ НЕ НАМЯКНУЛА, ШТО ЛЮДЗІ, ВІНАВАТЫЯ ВА ЎСІХ ГЭТЫХ ЗЛАЧЫННЫХ СКАЖЭНЬНЯХ РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ ЗАКОННАСЬЦІ, ПАВІННЫ БЫЦЬ СУРОВА ПАКАРАНЫ. Газэта яўна занятае сьлады, імкнецца схаваць канцы ў ваду.

Спачатку яна цэлымі месяцамі маўчыць, спакойна праходзіць міма злачынньнейшых скажэньняў партыйнай лініі ў раёне. Праходзіць міма і райком. За апошнія часы ён зьмясьціў у газэце нямала сваіх самых розпастайных пастаноў, але ў іх — ні слова аб перагібах і парушэньнях рэвалюцыйнай законнасьці, якія дапускаюцца ў раёне. Потым рэдакцыя нарэшце пачынае разумець, што маўчаць увесь час нельга і проста небясьпечна. У ход пускаецца хітрый маёўр: давайце напішам, што ў нас робіцца ў раёне, але так, каб нікога не пакрыўдзіць. І пішуць. Зьмяшчаюць артыкул з самымі агіднейшымі фактамі. Прызнаюцца, што ў раёне перагібаў фактычна ніхто ня выпраўляе, ганебна хвалацца, што «могуць падаць цэлыя сотні выпадкаў парушэньня рэвалюцыйнай законнасьці», і на гэтым ставяць кропку. Пашумелі, памахалі кулакамі ў пустое паветра — супакоіліся, далікатна паабяцаўшы толькі:

«...у далейшым не дапускаць такіх парушэньняў...» (!)

Вось яна самакрытыка па-асьвейску. Людзі хочуць выйсьці сухімі з вады. Ня ўдасца!

М. Мазуркевіч

ДА ВЫНІКАЎ ДРУГОЙ КАНФЭРЭНЦЫІ КАМСАМОЛУ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

У чэрвені адбылася канфэрэнцыя камсамолу Заходняй Беларусі. Канфэрэнцыя, якая сабралася больш чым за год пасьля першага зьезду камсамолу, мела задачай падвесьці вынік разьвіцьця камсамолу за перыяд пасьля першага зьезду, абагуліць вопыт шматбаковай дзейнасьці КСМ ЗБ, улічыць асноўныя слабасьці і недахопы з тым, каб на перамаганьне іх згуртаваць увагу і сілы камсамольскай арганізацыі.

Канфэрэнцыя праходзіла ў асаблівых умовах міжнароднай сітуацыі і рэвалюцыйнага руху росту ў Польшчы і Заходняй Беларусі. Небясьпека інтэрвэнцыі супроць Савецкага саюзу з боку аб'яднаных сіл імпэрыялістаў, з боку фашысцкай Польшчы стала актуальнай, як ніколі яшчэ раней. Вайна на Ўсходзе, акупацыя Манчжурыі акрыяліла польскіх фашыстаў. Паход Японіі на Кітай у фашысцкай Польшчы азнаменаваны новай хваляй ваеннай падрыхтоўкі і арганізацыі вайны. Польская буржуазія пускае сьліну ў чаканьні, каб чым хутчэй пагрэцца на ваенным агні супроць СССР.

Для гэтай вайны рыхтуецца насельніцтва, рыхтуецца сама тэрыторыя Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, адкуль польскія фашысты зьбіраюцца пасьлаць першыя спарады і кулі супроць Савецкага саюзу. Прыпусковае вайсковае навучаньне пашыраецца на ўсё больш шырокія колы моладзі. Ва ўсіх сярэдніх школах Польшчы ўведзена абавязковае вайсковае навучаньне ня ў адной Вільні ахоплена звыш 2.000 чалавек. У Заходняй Беларусі гэта абавязковае вайсковае навучаньне пашыраецца і на дзяцей старэйшых клясаў пачатковых школ. Акупанты стараюцца паўсюдна пасадзіць свае мілітарыстскія арганізацыі. У акупаванай ЗБ «усё маладое пакаленьне павінна стаць пакаленьнем салдат»,—так піша віленская газэта «Кур'ер Віленскі», абмяркоўваючы, як лепш разьвіць работу «Стральца». Калі году, як уведзен дэкрэт аб мілітарызацыі чыгунак, а зараз ужо ў чыгуначнае вайсковае навучаньне зацягнута да 40.000 чалавек. Заходняя Беларусь паскорана ачышчаецца ад рэвалюцыйных элементаў. Абвастраецца фашысцкі тэрор. Бесь нерапынна ўзрастае колькасьць сьмяротных прыгаворў і забойстваў у засьценках дэфэнзывы. У Заходняй Беларусі, раней чым дзе-небудзь, укідвалася кара сьмерцю над моладзьдзю — 20, 18 і нават 17 год. З верасьня 1932 году ў дадатак да ваенна-паляўных судоў, якія ўжо дзейнічаюць, уводзіцца дэкрэт аб тым, што будзе засуджацца на кару сьмерцю, або на пажыцьцёвую катаргу кожны, дзейнасьць якога накіравана супроць фашысцкага ладу.

Увесь цяжар ваеннай падрыхтоўкі польскага імпэрыялізму, цяжар крызісу, які ўсё больш наглыбляецца, нясуць працоўныя масы і масы працоўнай моладзі. Гаспадараньне польскіх імпэрыялістаў у Заходняй Беларусі давяло да надзвычайнай галечы і зруйнаваньня працоўных. Замірае прамысловасьць, расьце беспрацоўе. Праводзіцца так званы «прыстараўскі дэкрэт», паводле якога з фабрык і заводаў выкідваецца перш за ўсё моладзь і ў першую чаргу моладзь прыгнечаных нацыянальнасьцяй. Калі нават ты яшчэ працуеш, дык стаіш пад пагрозай быць зволеным з работы.

На ўсім фронце наступаюць каліталісты і памешчыкі, польскія акупанты на працоўных і працоўную моладзь. Наступаюць тым, што зрываюць зарплату. Наступаюць тым, што за падаткі зьдзіраюць апошнюю капулю, наступаюць на школу, на нацыянальна - вызваленчыя арганізацыі. Наступаюць і на ідэалёгічным вучастку. Усе буржуазныя партыі ўзмоцнена працуюць над тым, каб умацаваць свой уплыў сярод моладзі, зрабіць з моладзі паслухмяную зброю для вайны з Савецкім саюзам, прабуюць процістаўляць моладзь дарослым і выкарыстаць яе ў задушэньні рэвалюцыйнай барацьбы працоўных.

Але ня толькі наступае азьвярэлая буржуазія і ўрад акупацый. Пралетарыят Польшчы і Заходняй Беларусі падае гераічныя прыклады барацьбы супроць гэтага наступленьня. Упэргай 10-тысячнай забастоўкай беластоцкія тэкстыльшчыкі, забастоўкай, на пераход ПЛС, далі адпор прадпрыемцам, якія прабавалі сарваць іх заработную плату. Гэта забастоўка зьяўляецца лепшым прыкладам гераічнай барацьбы пралетарыяту і гаворыць аб высокай яго рэвалюцыйнай актыўнасьці і гатоўнасьці змагацца супроць наступленьня капіталу. Толькі за апошнія некалькі месяцаў гайкаўскія рабочыя лесапільных заводаў некалькі разоў выходзілі на ўсеагульную забастоўку.

Гэта забастовачная хваля пашыраецца па ўсёй Заходняй Беларусі. У барацьбу ўцягваюцца новыя пласты пралетарыяту і рабочай моладзі. Рабочая моладзь прымае актыўны ўдзел у гэтых забастовачных баёх. Рабочая моладзь і яе авангард — камсамол часта зьяўляюцца арганізуючай сілай у тэй ці іншай забастоўцы, у тым ці іншым рэвалюцыйным выступленьні. Так было на пабудове чыгункі Друя-Варапаева, на лесапільным заводзе ў Варапаеве, сярод краўцоў Вільні, пекараў у Слоніме, дзе ініцыятарамі гэтых забастовак зьявіліся камсамольцы.

Барацьба супроць акупацый і нацыянальнага прыгнечаньня, барацьба сялянскіх мас супроць непасільнага падатковага цяжару, супроць прымусовых работ — шарварак, супроць тэрору — носіць усё больш шырокі і абвостраны характар. Кіруючая роля партыі і камсамолу ў гэтай барацьбе бязупынна і шпарка ўзрастае. Сялянская моладзь, на чале з камсамолам ня раз праганяла наяжджаўных у вёскі кіраўнікоў розных фашысцкіх арганізацый. Шырокія пласты працоўнай моладзі вёскі распазнаюць, хто іх барацьбу арганізуе і хто іх барацьбу прадае. Прыкваўшы польскіх акупантаў — беларускія нацыянал - фашысты са скуры лезуць вон, каб сярод моладзі стварыць свае арганізацыі, зацягнуць яе ў клешчы фашысцкіх арганізацый. Нацыянал-фашыст Астроўскі, які ўсхваляў школьны дэкрэт ураду, імем якога цяпер закрыты апошнія дзьве беларускія гімназіі, — перад летнімі канікуламі інструктуе вучняў, як дома, па вёсцы змагацца з камуністычным уплывам, як уводзіць пакліёп на БССР і СССР, як прадаваць нацыянальна-вызваленчую барацьбу працоўных.

Найбольш шырокія масы моладзі ў асобе нацыянал-фашыстаў ня толькі пазнаюць сваіх ворагаў, але і вядуць з імі актыўную барацьбу. Байкатуюцца і адсылаюцца назад нацыянал-фашысцкія газэты, дзе ўзводзіцца ўсякі пакліёп на кампартыю, на БССР і Савецкі саюз. Гэты фронт рэвалюцыйнай барацьбы працоўнай моладзі, разам з рабочымі і сялянамі, пад кіраўніцтвам кампартыі і камсамолу пашыраецца паўсюды і супроць зрыву зарплаты, і супроць зьвальненьня з фабрык, супроць падаткаў, супроць нацыянальнага прыгнечаньня і тэрору. «Працоўная моладзь зьяўляецца сустаўной часткай агульнага рэвалюцыйнага фронту рабочых і сялян. Цяперашнія ўмовы адкрываюць перад камсамолам вялікія магчымасьці змагацца за паскоранае заваяваньне рашаючай большасьці рабочай і шырокіх мас працоўнай моладзі для барацьбы за рэвалюцыйны выхад з крызісу, для барацьбы ў абарону СССР» (з рэзалюцыі II канфэрэнцыі).

У барацьбе за заваяваньне працоўнай моладзі за час пасьля 1-га зьезду камсамол ЗБ пакапіў вялікі вопыт. Узрос уплыў камсамолу ў масах моладзі. Камсамол за гэты час патроіў свае рады, стаўшы ў радзе раённых магутнай масавай арганізацыяй працоўнай моладзі, якая ўначальвае ле барацьбу за штодзённыя патрабаваньні і ў гэтай барацьбе папаўняе свае рады новымі сіламі. Ужо сёньня ёсьць паасобныя раёны, дзе камсамол, працуючы ва ўмовах зьверскіх рэпрэсій — тэрору, глыбокага падпольля, — колькасна ахапляе больш шырокія пласты працоўнай моладзі, чым якая небудзь фашысцкая, або іншая буржуазная арганізацыя моладзі.

Гэты ўплыў і рады камсамолу ўзрастаюць таму, што ён праяўляў вялікую актыўнасьць у барацьбе за штодзённыя патрабаваньні працоўнай моладзі. Працоўная моладзь пазнае сваю сапраўдную рэвалюцыйную арганізацыю, якая арганізуе яе барацьбу не на словах, а на справе. На словах «супроць вайны» «заклікаюць» выступаць сацыял-фашысты. На словах «супроць акупацый» гаворыць і нацыянал-фашысты. Але гэтыя словы, гэтыя «выступленьні» «за школу» нацыянал - фашыстаў, выступленьні «супроць вайны», «супроць зрыву заработнай платы» Тура і Цукуафта, зьяўляюцца мапэўрамі, фразамі, якія служаць ім для таго, каб атуманьваць масы і кідаць іх пад ногі акупантам, капіталістам і памешчыкам.

Працоўная моладзь бачыць камсамол у рэвалюцыйных справах, у дзеяньнях. Радам забастовак у Вільні краўцоў, у Варапаеве тартачнікаў, забастоўкамі сезоньнікаў у Глыбокім і Бельску, радам забастовак сезоньнікаў у мінулым годзе кіравалі камсамольскія арганізацыі. Камсамол, пад кіраўніцтвам партыі, арганізуе моладзь для актыўнай барацьбы супроць вайны. Некалькі сот сялянскай моладзі разам з сялянамі ў Картуз-Бярэзкім раёне Берасьцейшчыны дэманстравалі супроць вайны, у абарону СССР. Больш сотні моладзі Гродна на мітынгу пратэставалі супроць вайны, выбралі антываеннны камітэт барацьбы. 150 дапрызыўнікаў, якія пад'яжджалі цягнікам да Вільні, камсамольцы заклікалі на мітынг пратэсту супроць ваеннай падрыхтоўкі. Каля 100 чалавек рабочай і вучнёўскай моладзі Вільні ў адказ на закрыцьцё ТБШ, на арганізаваны камсамолам масоўны прымаюць рэзалюцыю пратэсту супроць нацыянальнага прыгнечаньня, супроць вайны з СССР.

Так выглядаюць рэвалюцыйныя будні камсамолу Заходняй Беларусі. Праз гэтую штодзённую барацьбу ў гарадох і мястэчках на прадпрыемствах і вёсках камсамол, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, рыхтуе моладзь да рашаючых баёў з фашысцкай дыктатурай.

Але камсамол ня быў-бы камуністычнай арганізацыяй, калі-б ён праходзіў міма сваіх слабасьцяй. Камсамол ня быў-бы арганізацыяй камуністычнага выхаваньня, калі-б у барацьбе, у перамаганьні гэтых сваіх асобных памылак, слабасьцяй, і недахопаў ня выхаваў-бы сваіх членаў для барацьбы за пралетарскую рэвалюцыю. Канфэрэнцыя камсамолу не апраўдала-б свайго назначэньня, калі-б яна з усёй рэзкасьцю і вострасьцю ня ўскрыла пасобныя памылкі, недахопы і слабасьці работы арганізацыі.

Сітуацыя і ўмовы зараз іншыя, чым год таму назад. У парадак дня фашысцкі ўрад ставіць вайну супроць СССР. Яшчэ больш абвастрыліся і клясавыя баі, набліжаюцца рашаючыя баі за ўладу. Усё гэта дыктуе камсамолу павышаныя патрабаваньні, задачы, патрабуе паскораных тэмпаў работы.

І гэтыя посьпехі, гэтыя дасягненьні ў рабоце і ў разьвіцьці ўсяго камсамолу пасьля 1-га зьезду, канфэрэнцыя прызнала невыстарчальнымі. Рад важнейшых задач, пастаўленых перад камсамолам зьездам і пастановамі партыі, камсамолам яшчэ не ажыцьцёўлены.

Камсамол не праявіў неабходнай ў цяперашніх умовах ініцыятывы ў барацьбе супроць вайны. У радзе арганізацый існуе амар тупіцтвенная недацэнка ваеннай небясьпекі. Дзе-ні-дзе прыкмячаліся на ваенную небясьпеку і на барацьбу з вайной гляндзець як на заўсёды стаячую пагрозу, заўсёды стаячую перад камсамолам задачу, ня бачачы за гэтым асобай вострасьці і актуальнасьці вайны сёньня.

Яшчэ дагэтуль у камсамоле няма неабходнага разуменьня значэньня нацыянальна-вызваленчай барацьбы, разгортваньня пралетарскай рэвалюцыі ў Польшчы і барацьбы супроць вайны. Гэта недацэнка асаблівага небясьпечна зараз. Камсамол яшчэ невыстарчальна і несвоечасова арганізуе моладзь для барацьбы супроць акупацыі вакол канкрэтных фактаў нацыянальнага прыгнечаньня і наступленьня на жыцьцёвыя ўмовы з боку капіталістаў, памешчыкаў і ўраду.

Галоўным недахопам зьяўляецца тое, што КСМ не дабіўся прыкметных зрухаў у завяваньні пралетарскіх элемэнтаў і ў першую чаргу фабрычна - заводзкіх рабочых і батракоў. Пры агульным росьце камсамолу ў тры разы, гарадзкія арганізацыі КСМ павялічыліся на 50 проц., а колькасьць фабрычна - заводзкіх ячэек узрасла толькі на 5 проц. Слабасьць пралетарскага ядра, нездавальняючае становішча гарадзкіх арганізацый, недацэнка высоўваньня актыву з пралетарскіх элемэнтаў і крайня-нязначная ўдзельная вага фабрычна - заводзкіх і батрацкіх ячэек зьяўляецца адной з асноўных прычын недахопаў работы КСМ. Прычыны гэтых недахопаў крыюцца і ў тым, што ў радах КСМ і актыву існуе недацэнка сітуацыі і тых задач, якія выцякаюць з хуткага насьпяваньня рэвалюцыйнага крызісу і падрыхтоўкі вайны. Невыстарчальнае азнаямленьне з пастановамі партыі і КСМ, няўменьне сваячасова канцэнтраваць сваю ўвагу на рашаючых вучастках рэвалюцыйнага разьвіцьця, гэтыя недахопы і слабасьці канфэрэнцыя з усёй вострасьцю паставіла перад арганізацыяй, як асноўныя, без перамогі якіх будзе тармозіцца далейшае разьвіцьцё камсамолу. Перамаганьне гэтых недахопаў, ліквідацыя адставаньня камсамолу ад растучай актыўнасьці працоўнай моладзі і задач, што прад'яўляе яму сітуацыя, зьяўляецца галоўнай задачай усёй арганізацыі.

Нашы ворагі, калі даведваюцца аб крытыцы гэтых недахопаў і слабасьцяй унутры камсамолу, пачынаюць каркаць аб крызе камуністычнага руху і г. д. Няхай каркаюць. Мы аб сваіх слабасьцях і недахопах гаворым для таго, каб іх зацісьніць, каб на барацьбе з імі вы

БЫТАВЫЯ ЎМОВЫ РАБОЧЫХ НА БАБРУЙСКІМ КАМБІНАЦЕ — „ВУЗКАЕ МЕСЦА“ Ў РАБОЦЕ ЗАВОДЗКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ

Лесапіленьне--адсталы вучастак камбінату

Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат лічыцца адным з буйнейшых прадпрыемстваў лясной прамысловасці ня толькі ў БССР, але і ў СССР. У гэтым годзе ён павінен даць рознай прадукцыі на 5 млн. руб., у тым ліку 477 стандартных дамоў і 150 сіласных веж для калгасаў і саўгасаў.

Асобныя цэхі, камбінату, якія па-ўдарнаму перабудавалі сваю работу, ня толькі выканалі, але і перавыканалі свае пяцігадовыя вытворчыя праграмы.

Аднак, на камбінаце забыты аснoўны вучастак работы—піламатар'ял. У працы лесапільнага ёсьць вялікае адставаньне. Лесацэх і завод № 6 з месяца ў месяц ня выконваюць сваіх вытворчых заданьняў. За першы квартал лесацэх ажыцьцявіў праграфіцыяну усяго на 89,1 проц., за красавік—на 66,3 проц. Май даў некаторае павышэньне: плян выканан на 104 проц. Але ў чэрвені тэмпы работы рэзка панізіліся: заданьне выканана толькі на 85 проц.

Яшчэ горш працуе завод № 6, які ў першым квартале ажыцьцявіў вытворчую праграму ўсяго на 24,7 проц., у другім—на 52,3 проц.

Адгрузка піламатар'ялу праходзіць вельмі марудна. На складах камбінату ляжыць больш 80 вагонаў прадукцыі.

Асноўнай прычынай адставаньня зьяўляецца зусім слабае ажыцьцяўленьне 6 умоў тав. Сталіна ў рабоце лесапільнага. Асабліва дрэнна стаіць справа з жыльлёвымі ўмовамі рабочых. Пабудаваны 12 бараках, кіраўніцтва па гэтым супакоілася, а тое, што ў бараках брудна, арганізацыі заводу зусім ня турбуе. На пасёлку «Пралетары», дзе жыве больш паўтары тысячы рабочых з іх сем'ямі, ёсьць усяго дзьве студні, якія ня могуць задаволіць усіх жыхароў вадой. Ужо два гады, як ідзе гутарка аб пабудове водаправоду, але справа з месца ня рушаецца. Як Бабруйскі гарсавет, так і кіраўніцтва камбінату ніякіх мер да пабудовы водаправоду ня ўжываюць.

Ня лепш справа і з рабочым забесьпячэньнем. На камбінаце ўжо другі год існуе свой ЗРК, але ён дагэтуль не перабудаваў сваёй работы так, каб быць сапраўдным памочнікам у выкананьні праграфіцыяну. ЦК ВКП(б)Б у сваёй пастанове аб разбазарваньні на камбінаце хлеба, даў жорсткую дырэктыву аб максымальнай яго эканоміі і палепшэньні рабочага снабжэньня за кошт разгортваньня самазагатовак. Здавалася-б, што кіраўніцтва ЗРК па-сапраўднаму павінна было ўсяцца за рэалізацыю данай пастановы. Аднак, у гэтых напрамку нічога ня зроблена. Эканомію хлеба ЗРК разумее па-свойму. Старшыня праўленьня даў распараджэньне крамнікам замест 30 дзён у месяц, даваць хлеб на 27 дзён.

Зусім дрэнна пастаўлена забесьпячэньне камбінату запаснымі часткамі для машын. Ёсьць 5 аўтазоваў, а працуе толькі адзін. Астатнія стаяць з прычыны адсутнасьці запасных частак. Каля цэху скапілася шмат чатовых матар'ялаў, якіх нельга вывезьці з складу. Прысланыя Белдрэвам пілы не падыходзяць для выробу патрэбных гатункаў. Не хапае запасных частак і для вартатагаў беларэўнага і стандартнага цэхаў.

Н.

Вытворчая праграма пад пагрозай

(Ліст рабочага Рагачоўскага райкамбінату)

Слабае ажыцьцяўленьне 6 умоў тав. Сталіна на нашым камбінаце прывяло да ганебнага адставаньня ў выкананьні вытворчай праграмы. Праграфіцыян першага паўгодзьдзя выкананы усяго на 28,6 проц. За гэты час краіна недатрымала прадукцыі на 30 тыс. руб.: 1,5 млн. штук цэглы-сырцу і 46 тыс. шт. абкыт-цэглы.

Партыйная, камсамольская і прафсаюзная арганізацыі не перабудавалі сваёй работы, не павярнулі яе тварам да вытворчасьці. Масава-вытворчая работа ў нізавых зьвеньнях належным чынам не разгорнута. У выніку працэсцыпліна сярод рабочых значна аслабла. На адной цагельні прагулы за 6 месяцаў складаюць 344 чалавекадні. Механічныя прастоі—266 чалавекадзён.

Слабая перабудова зарплаты, налічэньне ўрэўнікаўкі выклікалі цякучасьць рабочай сілы. За чэрвень пакінула работу 116 чалавек.

Калі па работу камбінату ня будзе зьвернута выстарчальная увагі з боку раённай партарганізацыі і РВК, дык вытворчай праграме пагражае зрыў.

Грыгор'еў.

Неадкладна дабіцца пералому ў праверцы калдагавароў

На падставе дырэктыў УсеЦВКВ і ЦКВСБ, з 1 ліпеня па 1 жніўня праводзіцца масавая самаправерка выкананьня калдагавароў, якая ўвязваецца з праверкай практычнага выкананьня 6 гістарычных умоў тав. Сталіна. Значэньне данай праверкі значна ўзрастае таму, што, ня гледзячы на вялізарны рост прадукцыі асобных галін прамысловасьці, усё-ж на рэзке прадпрыемствах вытворчая праграма поўнасьцю ня выконваецца. Вось чаму ЦКВСБ зусім правільна і своечасова паставіў перад прафсыпкальнымі і гаспадарчымі арганізацыямі задачу: даную кампанію правесьці пад кутом мабілізацыі рабочых мас на выкананьне і перавыкананьне праграфіцыяну па ўсіх яго паказальніках.

Работу трэба праводзіць шляхам шырокага разгортваньня сацыялабарніцтва паміж групамі, цэхамі, заводамі. Асабліва жорстка трэба падыйсьці да праверкі выкананьня абавязацельстваў, якія датычаць матар'яльна - бытавых інтарэсаў рабочых і служачых (грамадзкае харчаваньне, жыльдаўніцтва, тэхніка бясьпечнасьці, санітарныя ўмовы). Выявіць тых, хто ня цэлен на-бальшавіцку змагацца за рэалізацыю 6 гістарычных указаньняў тав. Сталіна, адначасова вызначаючы канкрэтныя мерапрыемствы, якія-б забясьпечылі выкананьне калдагавору, як двухбаковага абавязацельства. Вось кораткa тыя задачы, якія пастаўлены перад прафсаюзнымі і гаспадарчымі арганізацыямі.

Аднак, тэмпы праверкі не забясьпечваюць выкананьня вышэйпаказаных задач. На большасьці прадпрыемстваў слаба разгорнута масава - растлумачальная работа вакол значэньня гэтай кампаніі, а такія прадпрыемствы, як завод «Ударнік», «Камунар», Бабруйскі дрэваапрацоўчы камбінат зусім не разгарнулі масавай работы. На заводах «Пралетары», імя Сталіна абмежаваліся рэзалюцыямі. У выніку такіх адносін у асобных прафарганізацыях мы маем скажэньні ў праверцы калдагавароў. На заводзе «Ударнік», Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце замест вылучэньня ЧКК і арганізацыі брыгад абмежаваліся стварэньнем штабу. На заводзе імя Варашылава дабіліся эруху, але замацаваць яго на здолелі, бо агульна-заводская ЧКК у дакорнным спыніла работу. Заўвем ня прыняў неабходных мер да выпраўленьня гэтых недахопаў. У выніку асобныя цэхкамітэты (кавальскі, рамонтны, сьлясарны) да сапраўднай праверкі калдагавароў не прыступілі.

Буйныя скажэньні мы маем па саюзе грамадзкага харчаваньня ў Гомелі. Там да кампаніі падышлі фармальна, без масава-растлумачальнай работы. Склікалі сход, прачыталі кожны пункт калдагавору паасобку і канстатавалі: выканалі ці ня выканалі гэты пункт, на гэтым і закончылі сваю работу. Па саюзе кадэрацыі і дзяржгандлю ў Гомелі згубілі калдагавор. Паасобныя прафарганізацыі (трамвайнічкі — Менск і інш.) зрабілі спробу скончыць праверку ў некалькі дзён, змазаўшы ўсю арганізацыйную работу.

Вось кароткі малюнак, які характарызуе, як на месцах адносяцца да выкананьня пастановы прэзыдыуму ЦКВСБ.

Чым-жа тлумачыцца такое становішча?

Тлумачыцца тым, што рад ЦП саюзаў да праверкі калдагавароў адносяцца пасыўна. ЦП саюзаў камунальнікаў, друкароў, фінбанкаўскіх работнікаў абмежаваліся дырэктывамі мясцом. Толькі цяпер ЦП саюзаў гарбіроў, лесарэў, мяса-рыбнікаў некалькі дзён таму назад у дапамогу прадпрыемствам паслалі сваіх работнікаў, а іншыя ЦП яшчэ толькі мяркуюць паслаць.

Яшчэ горш, калі ў некаторых інфармацыйных зводках мае месца «очковтирательство». ЦП саюзу мукамольна - хлебнай і кандытарскай прамысловасьці паказвае, што ўся іх работа праводзіцца шляхам разгортваньня сацыялабарніцтва і ўдарніцтва. У інфармацыйных зводках многія ЦП паказваюць, што праверка калдагавароў праходзіць добра, скажэньняў ніякіх няма, а на справе зусім адваротны малюнак. Зразумела, ня ведаючы, што робіцца на месцах, ЦП саюзаў ня могуць кіраваць.

Неабходна мабілізаваць максымальную колькасьць работнікаў, паслаць іх на прадпрыемствы, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на выпраўленьне скажэньняў. З таварышамі, якія паедуць на заводы, трэба правесьці спэцыяльныя інструкцыйныя нарады, дакладна абгаварыўшы мэтады работы з тым, каб гэтыя таварышы здолелі аўладаць тэхнікай праверкі.

Побач з гэтым трэба дабіцца, каб культмасавыя арганізацыі не стаялі ў баку, як гэта мае месца на большасьці прадпрыемстваў (няма лёзунгаў, плякатаў). Заводскі друк таксама невыстарчальна займаецца гэтым пытаньнем. Трэба ўвесь вопыт масавай работы саюзу, усе сілы прафарганізацыі мабілізаваць для ўзорнай праверкі двухбаковых абавязацельстваў, асабліва па сацыяльна - бытавых пытаньнях, мабілізуючы рабочых на барацьбу за выкананьне колькасных і якасных паказальнікаў пляну 4-га заключнага году пяцігодкі.

Па разультатах масавай праверкі выкананьня калдагавароў трэба разглядаць, як тая ці іншая прафарганізацыя ажыцьцяўляе на справе баявыя дырэктывы 9-га зьезду прафсаюзаў, як яна перабудоўвае сваю работу на падставе ўказаньняў т. т. Сталіна і Кагановіча.

Сіманенка.

„Пражыў і кропка“

(Ліст настаўніка)

Старшыня Возерскага сельсавету, Дзяржынскага раёну, тым настаўнікам, якія зьвяртаюцца за атрыманьнем мукі за прашоўшы час, кажа:

— Пражыў і кропка. Няма чаго тут мяне валаводзіць з пейкім там хлебам.

Гэта добра, калі загаворыць, а то бывае і слова ад яго не пачуеш.

Сельсавет таксама прабуе даняць настаўнікаў нявыплатай пэнсіі. Напрыклад, большасьць настаўнікаў ужо больш месяца не атрымлівае пэнсіі і ня можа выехаць у адпачынак на летні час. Ня гледзячы на тое, што РВК была дана тэлефонаграма, каб сельсавет у тэрміновым парадку выплаціў пэнсію настаўнікам, старшыня сельсавету няхоча выкапаць гэту дырэктыву РВК. Настаўніку нашага сельсавету абураны такімі адносінамі да іх.

Дзяржынскі РВК павінен указаць Возерскаму сельсавету на недапушчальную цягаціну ў выплаце пэнсіі настаўнікам.

Асьветнік.

Вайцяховіч ігнаруе дасьледчую справу

(Ліст дасьледчыка)

Ужо тры гады, як у нашай краіне існуюць апорныя дасьледчыя пункты на балотах Палесься. Адзін з такіх пунктаў арганізован пры саўгасе **імя Х годзьдзя БССР.**

Дзяржава дасьледчым апорным пунктам надае вялізарнейшае значэньне, даны цьвёрдыя ўказаньні аб стварэньні належных умоў для работы гэтых пунктаў. Гэта здаецца такая зразумелая справа, што аб ёй ня варта было-б і гаварыць. Але гэтага ніяк ня можа зразумець дырэктар саўгасу **Вайцяховіч.**

Для таго, каб дасьледы былі зроблены правільна, неабходна на пункце мець памяшканьне для сушкі расьлін. На нашы просьбы пабудаваць такое памяшканьне, Вайцяховіч ня хоча зьвярнуць ніякай увагі.

Аб пабудове гэтага памяшканьня ўжо некалькі разоў падымалася пытаньне на пасяджэньні рабачкому, на вытворчых нарадах, выносіліся пастановы і г. д. І ўсё гэта засталося бяз вынікаў. Зараз ужо разгортваецца ўборка дасьледчых вучасткаў, а **памяшканьня няма.**

Наогул Вайцяховіч усякім чынам ігнаруе тых дасьледчыкаў, якія працуюць у саўгасе.

—Ты не саўгасьнік і мы не абавязаны аб табе клапаціцца, адзін адказ Вайцяховіча на ўсе нашы просьбы.

Адпаведныя арганізацыі павінны ўказаць Вайцяховічу на яго нядбайныя адносіны да тых дасьледаў, якія праводзяцца ў саўгасе.

Лапіцкі.

Падзённікі і безгаспадарчасьць

(Ліст калгасьніка)

У калгасе „Свабодны труд“, Хоцімскага местачковага савету, Касьцюковіцкага раёну, дрэнна пастаўлена арганізацыя працы.

Ня гледзячы на рад важнейшых пастаноў і ўказаньняў аб арганізацыі працы, у калгасе яшчэ ня выведзена падзённічына і ўраўнілаўка.

Зараз калгас прыступіў да ўборкі сенажаці. Касьба і іншыя ўборачныя работы праходзяць у парадку падзённых работ. За выкананыя работы калгасьніку ставяць палачку і больш нічога, бяз усякага ўліку колькасьці і якасьці выкананай работы.

Коні да наўных работнікаў не прымацаваны і часта бываюць сваркі з-за коняй, бо кожны хоча ўзяць лепшага. Гэта прыводзіць да спазьненьня ў выхадзе на работу і г. д.

Праўленьне калгасу, на чале са старшынёй **Раманенкам**, сваёй бязьдзейнасьцю патурае гультаям і іншым зрыўшчыкам арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасу.

В. Ч.

АД РЭДАКЦЫІ: „Зьвязда“ чакае ад Касьцюковіцкага райкалгасаюзу адказу па лісту калгасьніка В. Ч.

Койданаўскаму райздраву „дапамагаюць“... шаптуны

(Ліст калгасьніка)

Каля Самахвалавіцкага мэдпункту кожны дзень вялікая чарга наведвальнікаў, якіх работнікі мэдпункту не спраўляюцца абслужыць. І ня дзіва, бо там гэтых работнікаў фактычна няма, калі ня лічыць адной акушэркі, для якой і сваёй непасрэднай работы хапае і якая звычайна пасылае хворых у Менскія або іншыя больніцы.

А дзе-ж самахвалавіцкія мэдработнікі?

Раней была адна жанчына доктар Адамава, але яна кінула работу і невядома куды ўдзяла. Тлумачыцца гэта тым, што Койданаўскі райздраў не клапаціўся аб ёй, не дапамагаў ёй у працы.

Каб «выправіць сваю памылку», кіраўнікі Койданаўскага райздраву прысылаюць у Самахвалавічы 1-2 разы ў дэкаду студэнта-практыканта, які прыяжджае ў Самахвалавіцкі мэдпункт на 2-3 гадзіны і ня мае магчымасьці задаволіць нават і дзесятай долі запатрабаваньняў хворых.

Такое «мэдабслугоўваньне» з боку Койданаўскага райздраву спрыяе пашырэньню па Самахвалавіцкім сельсавеце знахароў і шаптуноў.

Няўжо Койданаўскі райздраў будзе задаволен «дапамогай» гэтых ашуканцаў? А можа ён, наадварот, прыме належныя меры, якія-б забясьпечылі добрую работу Самахвалавіцкага мэдпункту?

Калгасьнік.

На лісты рабочых і калгасьнікаў рэагаваць хутка і вычарпальна

Кожны дзень «Зьвязда» атрымлівае шмат лістоў рабочых і калгасьнікаў аб бюракратызьме і бязгаспадарчасьці, шмат просьб і практычных прапаноў аб зьнішчэньні тых ці іншых недахопаў.

У кожным нумары «Зьвязды» зьмяшчаюцца гэтыя лісты. Шмат іх пасылаецца і на расьсьледваньне.

Кожны ліст рабочага і калгасьніка павінен знайсьці самае хуткае рэагаваньне. На жаль, ня ўсюды так робіцца.

Пачынаючы з 1 па 17 ліпеня бягучага году ў «Зьвязьдзе» зьмешчана 53 лісты рабочых і калгасьнікаў. За гэты-ж час атрымана **толькі 10 паведамленьняў** аб рэагаваньні. Але слова «рэагаваньне», як кажуць, разуменьне «гумовае». **Кожная арганізацыя рэагуе па-свойму.** Некаторыя арганізацыі і ўстановы стараюцца адмахнуцца ад лістоў.

Вось прыклады. Па лісту калгасьніка з калгасу імя Сталіна, Бешанковіцкага раёну, у якім ён указвае, што **член праўленьня калгасу Бусеў разбурае калгас, Бешанковіцкая райКК-РСІ піша: «Увесь матар'ял перадан судова-сьледчым органам для прыцягненьня вінаватых да адказнасьці».**

Рэчыцкая райКК-РСІ справу аб злачынствах у дарграбкопе перадае сьледчаму для прыцягненьня вінаватых да адказнасьці.

Вось характэрныя і да зьдзіўленьня шаблённыя адказы па лісты рабочых і калгасьнікаў. Яны сьведчаць аб тэндэнцыі некаторых райКК-РСІ скінуць з сябе адказнасьць.

Такое, з дазволу сказаць, «рэагаваньне» нічога не каштуе, бо яно нікога ня можа задаволіць. **Мала вынесьці пастанову. Трэба яе рэалізаваць. Мала зьняць з работы, аддаць пад суд. Трэба дабіцца аздараўленьня работы фабрыкі, калгасу і г. д. Толькі такое рэагаваньне мае цану.**

Узоры галавацяпскага падыходу да расьсьледваньня лістоў паказвае Менскі трэст грамадзкага харчаваньня. У «Зьвязьдзе» за ліпень месяц былі зьмешчаны: ліст студэнта «Патрэбны рашучыя захады» — аб агідных зьнішчах у сталоўцы па Камсамольскай вуліцы № 12, ліст пастаўніка «Да ўвагі трэсту грамадзкага харчаваньня— аб дрэнным рабоце пастаўніцкай сталоўкі.

Трастам грамадзкага харчаваньня абодва лісты проста **ігнаруюцца да загадчыкаў тых сталоўак, аб якіх пісалася ў газэце.**

І гэта трэст грамадзкага харчаваньня называе расьсьледваньнем. **Каго гэта можа задаволіць, акрамя сапраўднага бюракрата, якому ўсёроўна, як зроблена справа, абы толькі «падпісаць і з плеч далоў».**

Мы тут паказалі ўзоры казённых адносін да лістоў. Але ёсьць і такія, якія зусім маўчаць. **Да гэтага часу маўчаць: Рагачоўская райКК-РСІ, да якой накіраван ліст чырвонаармейца Гаворчанка аб тым, што яго сям'і не дана пэнсія; Ельская райКК-РСІ аб лісьце «За што мяне зьнялі з работы»; менсійя судова - сьледчыя органы нясуць зьдзеку над работніцай Гатавай. Маўчаць: Клімавіцкая, Слуцкая, Смалявіцкая, райКК-РСІ, куды накіраваны лісты.**

Прыведзеныя факты паказваюць, што многія арганізацыі нядбайна адносяцца да такой важнай справы, як рэагаваньне на лісты рабочых і калгасьнікаў.

Як трэба разглядаць недадзіку лістоў рабочых і калгасьнікаў? Ня інакш, як ігнараваньне дырэктыў партыі аб разгортваньні самакрытыкі, аб прыслухоўваньні да голасу працоўных.

«Зьвязда» чакае ад партыйных арганізацый рашучага пералому ў справе рэагаваньня на лісты рабочых, калгасьнікаў, служачых і іншых працоўных, якія (лісты) зьмяшчаюцца ў друку, або пасылаюцца на расьсьледваньне.

Па сьлядох рабселькораўскіх лістоў

Селькор з Капыльскага раёну паведаміў «Зьвязду» аб тым, што райкалгасаюз весьнавую сяўбу сустрэў не падрыхтаваным. Мі нэральнае ўгнаеньне звыш 500 цэнтнэраў не рэалізавана па калгасах. Складаньнем вытворча-фінансавых плянаў, арганізацыяй брыгад не займаліся. У апараце райкалгассамозу — поўная абязьлічка і адсутнасьць канкрэтнага кіраўніцтва. **Пры праверцы факты пацьвердзіліся. Пастановай РК КП(б)Б праўленьне райкалгассаюзу распушчана і кіраўніцтва адноўлена.**

***

Калгасьнік Бешанковіцкага раёну (Камёнаўскага сельсавету) напісаў нам аб тым, што кіраўнікі калгасу «Новая Зара» — старшыня калгасу Рычко, член праўленьня Шчарбакоў, старшыня сельсавету Лібхен і інш. заняліся самаснабжэньнем прадуктамі і прамтаварамі, загадчык гаспадаркі Шчарбакоў вазіў прадаваць пасеннае калгаснае бульбу, якую мяняў на вопратку для ўласных патрэб. Гэта кампанія за час сваёй работы выключыла з калгасу 20 бядняцка - серадняцкіх гаспадарак. **Пры расьсьледваньні факты пацьвердзіліся. Бешанковіцкая райКК-РСІ пастанавіла зрабіць рэвізію калгасу і ўвесь матар'ял перадаць судова-сьледчым органам для прыцягненьня вінаватых да адказнасьці.**

***

Селькор Рагачоўскага раёну паведаміў нам, што Стаўпянскі сельсавет парушае рэвалюцыйныя законы. Сакратар партыйнай ячэйкі Куляшоў згубіў клясавую пільнасьць, заціскаў беднату і серадняцкую масу, даваў пераважні кулацка - заможным гаспадарам. Сельсавет замест правядзэньня масавай работы накладаў штрафы, за некаторы час аштрафаваў 87 гаспадарак на суму 3.134 руб. Старшыня сельсавету што хацеў, тое і рабіў, нават аштрафаваў члена калгасу Рабіновіча за тое, што ён наладжваў рэлігійнае сьвята.

Пры расьсьледваньні факты пацьвердзіліся. Рагачоўская РКК-РСІ пастанавіла старшыню сельсавету прыцягнуць да судовай адказнасьці, а сакратару ячэйкі Куляшову даць суровую вымову са зьняцьцем з работы.

***

Калгасьнік Зімніцкага сельсавету (Быхаўскага раёну) у сваім допісе прасіў «Зьвязду» ўмяшацца ў справу старшыні калгасу імя Блюхера Старавойтава Захара і сакратара партыйнай ячэйкі Касьцючэнкі, якія доўгі час займаліся самаснабжэньнем. Касьцючэнка атрымаў 24 пуды жыта, бульбы, ячменю і інш., у той час, як ён усе прадукты атрымліваў у спажыўкаапэрацыі. З боку праўленьня калгасу—поўная безгаспадарчасьць, ня створан кармовы баланс, у выніку чаго стравілі 2.000 пуд. жыта і інш. с.-г. культур. Сакратар ячэйкі Касьцючэнка страціў клясавую пільнасьць, запалохваў беднату і батрацтва, урэшце выключыў трох калгасьнікаў з калгасу.

Пры расьсьледваньні факты пацьвердзіліся. Быхаўская райКК-РСІ пастанавіла: сакратара ячэйкі тав. Касьцючэнка з працы зьняць, вывесьці са складу членаў райКК і абвясьціць яму суровую вымову.

***

Селькор Буда - Кашалёўскага раёну зьвярнуўся ў рэдакцыю «Зьвязды» з лістом, у якім указвае на рад агідных зьнішч з боку праўленьня калгасу «Чырвоны Пахар» № 2. Старшыня праўленьня т. Сямёнаў і члены Гаеў Васіль і Гаеў Марка заняліся п'янствам, гультайствам, да 3-й бальшаніцкай вясны не падрыхтаваліся, насенныя фонды ня былі ссыпаны, плян сяўбы адсутнічаў. Яны займаліся «очковтирательством». **Пры расьсьледваньні факты пацьвердзіліся. Буда-Кашалёўская райКК-РСІ пастанавіла за безгаспадарнасьць і нядбайнасьць спра[illegible]**

ВЫСТУПЛЕНЬНІ ПОЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ТЭАТРУ УКРАІНЫ

Польскія працоўныя масы Савецкага саюзу, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, у выніку правільнага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі **дабіліся надзвычай вялікага разьвіцьця польскай культуры, літаратуры, мастацтва—сацыялістычных па зьместу і нацыянальных па форме.**

Яркім паказальнікам гэтага зьяўляецца **трывалае і работа стацыянарнага польскага дзяржаўнага тэатру Украіны і вандроўнага польскага дзяржаўнага тэатру БССР.**

Паталочы вялізарнае значэньне тэатральнаму мастацтву, як дзейнаму фактару мабілізацыі і выхаваньня працоўных мас вакол задач сацыялістычнага будаўніцтва, камуністычнай партыя аддавала і аддае вялікую ўвагу рэвалюцыю польскага тэатральнага мастацтва. Польскі дзяржаўны тэатр Украіны, які цяпер выступае ў Менску, павінен у бліжэйшыя часы перарасьці ва ўсенародны польскі тэатр. Таксама ёсьць пастанова Народнага камісарыяту БССР аб арганізацыі, апрача існуючага вандроўнага тэатру, стацыянарнага польскага тэатру БССР.

Нясупынны ўзрост культурнага ўзроўню польскіх працоўных мас СССР, ідэалёгічны і мастацкі рост савецкіх польскіх тэатраў вызначаюцца асабліва глыбока і рэльефна на фоне таго становішча, якое перажывае капіталістычная вёска, асабліва фашысцкая Польшча. Там культура ніцэйшая і больш і больш у балота капсэрватызму і зацтвяньня, там тэатр перажывае надзвычай цяжкі крызіс.

Польскі фашызм, які ўсякімі спосабамі стараецца выйсьці з выключна цяжкага катастрофічнага становішча, які рыхтуе ўзброены напад на СССР, падпарадкоўвае навуку, мастацтва, тэатр і літаратуру сваім фашысцкім мэтам і з шалёнай дзікасьцю праследуе і зьнішчае ўсялякія рэвалюцыйныя, праўдзівыя і мастацкіе, усялякія парасткі нацыянальнай культуры ў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне.

Вельмі яркім узорам гэтай фашысцкай палітыкі Польшчы зьяўляецца эпопея арышты сярод артыстаў і літаратараў (арышт выдатнага польскага рэжысэра Шылера, артыстак Гарынявіцкай, Мінцэвіч і іншых культурных дзеячоў). Паводле афіцыйных паведамленьняў, яны арыштаваны за тое, што падпісалі адозву, накіраваную супроць падрыхтоўкі нападу на СССР. Фактычна-ж польскі фашызм мае на мэце задушэньне і зьнішчэньне рэвалюцыйнай дзейнасьці ў галіне літаратуры і мастацтва.

Справа ў тым, што Шылер адважыўся паставіць у тэатры п'есу «Рычы Кітай» Трэцьякова. Ня гледзячы на старанное выкрасьленьне фашысцкай цэнзурай «агітацыйнага балясту»,—як піша фашысцкі друк,—гэта п'еса ў пастаноўцы Шылера стала сур'ёзным палітычным фактам і зброяй клясавай барацьбы. Посьпех п'есы «Рычы Кітай» у Львоўскім тэатры быў выключны. Пасьля некалькі спектакляў п'еса была забаронена фашысцкімі ўладамі, а сам Шылер зьнішчаўся за турэмнымі кратамі.

***

Польскі дзяржаўны тэатр Украіны імя Скрыпніка, які год таму назад выступаў у Менску выключна з пераводным рэпэртуарам, са слаба падрыхтаванымі калектывам у сэнсе тэатральнай игры, сёньня ўжо **мае багаты, рэвалюцыйны, высока-мастацкі рэпэртуар**—тры арыгінальныя п'есы польскіх пралетарскіх пісьменьнікаў, моцны акторскі калектыў, які разумее свае задачы, шукае ўласных творчых шляхоў, які паказвае, што **ўмее і можа змагацца за вялікую пэўнакроўную польскую пралетарскую культуру і мастацтва.**

Польскі Дзяржаўны тэатр Украіны, які арганізаваўся ў сакавіку 1931 г., у першы перыяд свайго існаваньня павінен быў правесьці жорсткую барацьбу супроць розных нацыянал-апартуністычных уплываў і плыняй нацыянальнага абмежаваньня, абыходжаньня тэматыкі сацыялістычнага будаўніцтва.

Пастаноўкаю «Гуты» Кобоца, «Хлеба» Кіршона і «Барацьбы 2 сьветаў» пралетарскага украінскага драматурга Макрэва, тэатр зрабіў **значны крок наперад па лініі пераманаваньня плюрадных недахопаў, па лініі барацьбы за высокі ідэалёгічны, клясававытрыманы і высока-мастацкі тэатральны паказ.**

У працэсе работы тэатр зрэтушаваў ва[illegible]

Дырэктар польскага дзяржаўнага тэатру Украіны тав. ГОРДЫЕНКО.

у новым памяшканьні, атрыманым ім у 14-ю гадавіну Кастрычніка ў падарунак ад ніжэйскага гарсавету. Гэты сэзон быў бязумоўна пераломным. Тэатр значна ўмацаваў авторскіх кадры, прыцягнуў новыя сілы, узмацніў сваю барацьбу за польскае пралетарскае мастацтва. Тэатр дабіўся вялікіх посьпехаў у стварэньні арыгінальнага рэпэртуару, пастаноўкі п'есы польскіх пралетарскіх пісьменьнікаў—«Грамадзкая справа»—[illegible]

Вітольда Вандурскага, «Штурм Чарнаводаў» —маладога польскага пралетарскага пісьменьніка Кавальскага.

***

Пасьля «Грамадзкай справы» Бруно Ясенскага, п'есы напісанай на матар'яле рэвалюцыйных выступленьняў польскага сялянства ў Галіцыі ў мінулым стагодзьдзі, якая знайшла шырокае прызнаньне з боку менскага працоўнага гледача, польскі дзяржаўны тэатр стаіць зараз ужо на працягу некалькіх дзён п'есу Вандурскага «Рабан».

«Рабан» Вандурскага гэта жывое адлюстраваньне сёньняшняй фашысцкай Польшчы, гэта вельмі блізкі да рэчаіснасьці паказ клясавых баёў, якія пад чырвонымі сьцягамі кампартыі вядзе пралетарыят Польшчы.

1931 год у Лодзі. Суровы год, год крызісу, галечы і бесправоў'я, год разьюшанага фашысцкага тэрору.

Два клясавыя лягеры. Буржуазіі са складаным фашысцкім апаратам, дэфэнзывай, войскам, паліцыяй, турмамі, пракурорамі, з лёйдзкай ППС, ББС і інш. шрагай сабак. Другі—адзіны, непахісны лягер рэвалюцыйнай барацьбы.

У спектаклі ўсё вышэй нарастае клясавая барацьба на адной з тэкстыльных фабрык Лодзі. Мы бачым сутычкі рабочых з майстрамі, супрацоўніцтва адміністрацыі з дэфэнзывай, іх здрадніцкімі прыспосабленьнямі. Барацьба ўзмацняецца. Забастоўка, правакацыя ППС, напад паліцыі, вулічныя баі, барыкады.

Дэфэнзыва ня сьпіць. Сьледзтва ў дэфэнзыве—пан камісар Кайданскі, які нават сярод буржуазіі вядомы, як садыст, «дапытвае». Пан камісар індывідуальна падыходзіць да кожнага зьвілаванага. Адных прымушае да здрадніцтва і правакацыі катаваньнямі, а іншых «бяро» хітрасьцю. Рэвалюцыя выкавала і такіх, якіх не злом'іш катаваньнямі. Такіх вельмі далікатна, нават без пабоя, Кайданскі выпускае на сваю беду, адных... Ён робіць гэта ў такіх абставінах, што блізкія таварышы зьдзьменага, сумленныя і адданага справе рабочага Лявона, надазраюць у правакацыі, баяцца яго і адхіляюць ад працы. Калі і гэта не дапамагае злакаць Лявона, Кайданскі загадвае яго застрэліць з-за вугла.

[illegible]

Пад турэмнымі сьцягамі настоўп, дэманстрацыя, сутычкі з паліцыяй. Даведаўшыся аб забойстве Лявона дэфэнзывай, палітычныя зьняволеныя абвяшчаюць «рабан» (турэмны бунт). Вось кароткі зьмест п'есы.

П'еса Вандурскага «Рабан», якая мае сур'ёзную ідэалёгічную і мастацкую вартасьць, зьяўляецца сур'ёзнай спробай поўнацэннага крытыцызнскага паказу на справе таго, як змагаецца пралетарыят Польшчы за рэвалюцыю. Аднак, яна не пазбаўлена рэшты памылак ідэалёгічнага і мастацкага характару.

Стэнічны «Рабан» польскі дзяржаўны тэатр Украіны паказаў свой значны ідэалёгічны і мастацкі рост, аўзбраіў багатым матар'ялам, даў яркі вобраз барацьбы польскага пралетарыяту.

Адначасова неабходна адзначыць, што пазаобныя сцэны ўсё-ж не падняты на належны ідэалёгічны і мастацкі ўзровень.

Рад недахопаў у пастаноўцы п'есы зьнікнуць добрай игрой рэду артыстаў тэатру. Да такіх трэба адносіць, перш за ўсё, артыста Хараб'ёўскага, які надзвычай удала перадаў тып «элегантнага» хітрага сацыста—фашысцкага камісара Кайданскага. Добра выканаў ролю рабочага Цянцяры артыст Гарнаевіч і артыстка Гельмер у ролі яго жонкі. Ня дрэнна выканалі свае ролі артыст Грыцкевіч, Захарчук, Казінскі і артыстка Арсенавіч.

Апошняй п'есай рэпэртуару польтэатру зьяўляецца «Штурм Чарнаводаў». Гэта п'еса адностроўнае ўдзел польскіх працоўных мас у сацыялістычным будаўніцтве, клясавую барацьбу ў польскай вёсцы СССР.

Выступленьні польскага тэатру Украіны ў Менску палучаюць добрае ўражаньне. Гэта сьведчыць аб тым, што тэатр шпарка расьце, што пасьпяхова змагаецца за аўладваньне марксыцка-ленінскім мэтадам у барацьбе за польскае пралетарскае мастацтва.

Мы ўпэўнены, што тэатр, пад кіраўніцтвам партыі, пераманаючы свае недахопы, будзе і ў далейшым змагацца за разьвіцьцё польскай пралетарскай культуры і мастацтва, за стварэньне вялікіх мастацкіх паказаў, вартых нашай эпохі сацыялістычнай.

З. ПЕЗОВСКІ.

Кампартыя Германіі заклікае да ўсеагульнай забастоўкі

20 прадвыбарчых сходаў

БЭРЛІН, 23 (ТАСС). Учора германская кампартыя правяла ў рабочых раёнах Бэрліну **20 прадвыбарчых мітынгаў.** На адным з мітынгаў прамоўца, які выступіў з заклікам да ўсеагульнай забастоўкі, быў зараз жа арыштаваны і мітынг быў распушчаны.

Па гораду ўчора і трэцяга дня былі распаўсюджаны тысячы камуністычных лістовак. 21 ліпеня каля заводаў, бірж працы і ў рабочых раёнах было распаўсюджана каля 600 розных лістовак-адозваў акруговага камітэту кампартыі. Адна з лістовак заклікала да ўсеагульнай палітычнай забастоўкі, але гэта лістоўка ў 200.000 экз. была канфіскавана паліцыяй. Гэты-ж заклік акруговага камітэту партыі надрукован у выглядзе плякату і расклеен па гораду. Многія фабрычна-заводзкія камуністычныя ячэйкі выдалі свае газэты і лістоўкі, мабілізуючы масы пад лёзунгам усеагульнай забастоўкі. Кам'ячэйка заводу «Сімэнса» выпусьціла спэцыяльны нумар заводзкай газэты ў 20.000 экз.

Учора вечарам выпушчана другая экстрэная лістоўка камуністычнай фракцыі рэйхстагу. Лістоўка, даючы аналіз здрадніцтва сацыял-дэмакратычных і рэфармісцкіх лідэраў, заклікае ўсіх рабочых, без розьніцы партыйнай прыналежнасьці, змагацца супроць фашысцкага наступленьня на працоўных Германіі. За распаўсюджаньне лістовак, заклікаючых да ўсеагульнай палітычнай забастоўкі, у **апошнія два дні арыштавана 300 рабочых,** вялікая колькасьць якіх перадана надзвычайнаму суду.

198 фабкомаў—за ўсеагульную забастоўку

БЭРЛІН, 23 (ТАСС). Канфэрэнцыя 198 фабрычна-заводзкіх і пэхавых камітэтаў, якая адбылася ў Вупэртале, аднадушна выказалася за абвяшчэньне ўсеагульнай забастоўкі і зьвярнулася да ўсіх рабочых Нізіняга Рэйну з заклікам пашырыць фронт бастуючых тэкстыльшчыкаў Гладсбаху. Бастуючыя тэкстыльшчыкі раёну Гладсбах-Рэйт правялі 21-га мітынг, на якім зьвярнуліся з заклікам да рабочых усіх заводаў пашырыць стачачны фронт.

Адозва палітбюро ЦК кампартыі Францыі

БЭРЛІН, 23 (ТАСС). **У «Юманітэ»** апублікавана адозва палітбюро ЦК кампартыі Францыі да францускага пралетарыяту аб падзеях у Германіі.

Цэнтральны Камітэт КПФ указвае, што апошнія падзеі ў Германіі зьяўляюцца «новым ударам, нанесеным працоўным масам Германіі германскай буржуазіяй пры падтрымцы імпэрыялістаў іншых краін і ў першую чаргу францускага імпэрыялізму». У гэтай адозве палітбюро ЦК КПФ заклікае францускі пралетарыят «ўзмацніць барацьбу за ліквідацыю вэрсальскага дагавору і ўсіх згод імпэрыялістаў, накіраваных супроць працоўных мас Германіі».

Палітбюро прапануе таксама зьвярнуць асаблівую ўвагу на ўзмацненьне агітацыі сярод сацыялістычных рабочых, растлумачваючы ім, што **здрадніцкая палітыка сацыял-дэмакратычных правадыроў прывяла да цяперашняга становішча ў Германіі.**

Заклік ўсегерманскага камітэту рэвалюцыйнай прафапазыцыі

БЭРЛІН, 24. «Камуністышэ Прэсэйдэнціст» апублікавала адозву ўсегерманскага камітэту рэвалюцыйнай прафапазыцыі. Спасылаючыся па паведамленьні газэт аб забароне рэвалюцыйнай прафапазыцыі, якая міркуецца, адозва заклікае ўсіх рабочых абараняць усімі сродкамі апошнія рэшткі легальнасьці прафесыянальных арганізацый. Адозва зазначае, што ў радах рэвалюцыйнай прафапазыцыі—сотні тысяч рабочых усіх партыйных напрамкаў. Камітэт заклікае да стварэньня адзінага фронту, да арганізацыі руху пратэсту і да барацьбы супроць зьніжэньня зарплаты, дапамог і пэнсій.

Заява баварскага прэм'ера Гельда

БЭРЛІН, 25. На масавым прадвыбарчым сходзе ў Вэйдэне баварскі прэм'ер Гельд адносна канфэрэнцыі ўрадаў германскіх прапасіўный заявіў: «Я магу канстатаваць, што пасьля заявы рэйхсканцлера Папэна і міністра ўнутраных спраў Гайля боязнь, якая мелася ў нас у апошнія дні, аказваецца, відавочна, беспрадметнай. У Штутгарце нам катэгарычна заявілі, што германскі ўрад ні ў адзін з іншых правінцый не назначыць дзяржаўнага камісара і ня думае аб тым, каб увесьці там стан аблогі. Апрача таго, нам заявілі, што 31 ліпеня выбары ў рэйхстаг адбудуцца пры ўсіх умовах і што рэзультат выбараў будзе рашаючым для далейшага лёсу Германіі».

Інтэрв'ю ўрадавага камісара Прусіі—Брахта

БЭРЛІН, 25. «12 Ур Блат» зьмяшчае інтэрв'ю з намесьнікам рэйхсканцлера фон-Папэна ўрадавым камісарам Прусіі—**Брахтам.** Брахт заявіў, што ў бліжэйшыя дні, напэўна, будзе адменен стан аблогі. Паводле слоў Брахта, ён апошнім часам абмяркоўвае гэта пытаньне з генэралам Рундштэтам.

На пытаньне супрацоўніка газэты аб магчымасьці забароны кампартыі, Брахт адказаў: «Выраішэньне гэтага пытаньня залежыць не ад мяне, а ад германскага ўраду. Аднак, я думаю, што да выбараў нічога на здарыцца. Мы ня хочам прадпрымаць чаго небудзь, што перашкаджала б парляманцкім функцыям і правом кампартыі».

Далей Брахт заявіў: «Кіраўніцтва Прусіі камісарамі, назначанымі германскім урадам, будзе да таго часу, пакуль удасца стварыць упарадкаваныя парляманцкія ўмовы і замяніць мяне ўрадам, выбраным лянтагам».

Вільгельм рыхтуецца да звароту ў Германію

ПАРЫЖ, 23. «Ніці парызіен» паведамляе з Гаагі, што ў сувязі з чуткамі аб падрыхтоўцы Вільгельмам свайго звароту ў Германію, дэпутат галяндзкага парляманту Роз зрабіў запытаньне ўраду, ці вядома яму, што манархічныя партыі Германіі ўвайшлі ў зносіны з Вільгельмам і што апошні ў сувязі з падзеямі ў Прусіі рыхтуецца да ад'езду. Роз пытаецца: ці ўжыў галяндзкі ўрад адпаведныя меры, якія дазволяць яму выканаць абавязацельствы па нагляданьні за тым, каб экс-кайзэр не прадпрымаў ніякіх актыўных палітычных крокаў.

Як паведамляе спэцыяльны карэспандэнт газэты, цыркулююць чуткі, што пасьля вы бараў у выпадку патрэбы «Вільгельм накіруецца ў Ландоорт, куды за ім прыбудзе ваеннае судна».

Жорсткая расправа над украінскімі сялянамі

Трое сялян у Саноку прыгавораны да кары сьмерцю, адзін—на бястэрміновую катаргу

У «Зьвязьдзе» ўжо паведамлялася, што гэтымі днямі пачаўся працэс у ваенна-палявым судзе ў Саноко **над 4-мя украінскімі сялянамі Ліскага павету,** дзе нядаўна выбухнула сялянскае паўстаньне супроць улады акупантаў.

Буржуазная прэса Польшчы, якая да гэтага часу старанна замоўчвала шматлікія факты рэвалюцыйных выступленьняў працоўных мас на Зах. Украіне і Зах. Беларусі, а таксама і ў карэннай Польшчы, зараз аддае гэтаму працэсу шмат увагі. Зьмяшчаючы розныя нябыліцы, узвальваючы віну за сялянскія выступленьні на «камуністычных агітатараў», фашысцкая прэса старанна такім чынам замазаць, скрыць перад шырокімі працоўнымі масамі сапраўдны сэнс і прычыны тых крывавых падзей, якія зараз разгортваюцца на ЗУ і ЗБ, і тым самым апраўдаць крывавую расправу фашысцкага ўраду над працоўнымі гэтых краін.

Але ня глядзячы на ўсё тэндэнцыйнае асьвятленьне як самой справы, так і працэсу, усё-ж з карэспандэнцый буржуазных пісак прарываюцца весткі, якія кідаюць яркае сьвятло на тыя прычыны, што прымушаюць выступаць сялянскія масы супроць улады акупантаў.

Так, эндэцкі «Дзэньнік Віленскі» ў № 172 мімаходам зазначае, што **«усе падсудныя апрануты ў лахманы і выглядаюць нэндзны».** Гэта адна фраза, сказаная мімаходам буржуазным журналістам, гаворыць аб усім. Калёніяльная палітыка акупантаў, якая давяла працоўных Зах. Украіны і Зах. Беларусі да поўнай гаспадарчай руіны, да голаду—вось тыя прычыны, якія прымушаюць сялянскія масы падымацца супроць улады эксплёататараў, супроць акупантаў.

Наколькі вялікая нянавісьць працоўных мас супроць улады акупантаў, надзвычай яскрава паказваюць паліцэйскія пратаколы, якія былі зачытаны на судовым працэсе а таксама і паказаньні цэлага раду сьведак—паліцэйскіх, памешчыкаў і ксяндзоў. З паліцэйскіх пратаколаў відаць, што ва «зуціхамірэньні» сялян у 3-х вёсках Ліскага павету брала ўдзел **50 паліцэйскіх на чале з 3 афіцэрамі і рота падгалянскіх стральцоў. Гэтыя часьці мелі 3 разы бой з тысячным натоўпам сялян. Баі гэтыя адбываліся ў 3-х вёсках, прычым у баю прымалі ўдзел нават жанчыны і дзеці, узброеныя матыгамі і віламі.**

Як зазначае эндэцкая «Газэта Варшаўска», апрача 4-х сялян, якіх судзяць зараз ваенна-палявы суд, **у турме ў Саноку знаходзіцца зараз яшчэ 200 сялян гэтага павету, арыштаваных у сувязі з «пацыфікацыяй».**

Падсудныя, як прызнае нават фашысцкая прэса, пераважна маладыя сялянскія хлапцы, самаму старэйшаму з іх 28 год.

Будынак суда акружан узмоцненымі атрадамі паліцыі з кулямётамі. На суд дапушчаны апрача абароны прадстаўнікі прэсы і самыя блізкія сваякі падсудных. Маса-ж сялян, якія прыбылі на працэс і якія прывезьлі для падсудных харчы, **на працэс не дапушчаны.**

На судовую расправу выклікана абвінавачваньнем 40 сьведкаў, у тым ліку **4 паліцэйскія камісары з Львова, а рэшта — паліцэйскія, ксёндз ды некалькі памешчыкаў.**

Падсудныя да віны ня прызналіся.

22 ліпеня вынесен прыгавор ваенна-палявога суда, на падставе якога трое падсудных прыгавораны да кары сьмерцю праз павешаньне, а адзін—на бястэрміновую катаргу. Па хадайніцтву абароны, кара сьмерці ўсім была заменена прэзыдэнтам рэспублікі **на бястэрміновую катаргу.**

Першаму выпуску віцебскага індустрыяльна-пэдагагічнага інстытуту

Дарагія таварышы!

Шкадую, што не магу выканаць ваша пажаданьне прысутнічаць сярод вас у радасны дзень, калі вы перадаеце, культурнаму фронту дзесяткі новых байцоў. Упэўнен, што першы выпуск з гонарам выканае свае задачы.

Культурнаму фронту зараз асабліва патрэбны вашы сілы і веды. Больш чым калі-небудзь на вас кладзецца цяжкая, ганаровая праца па выкарчоўваньні капіталістычных забабонаў, невуцтва, мяшчанства, каб у энэргічнай працы выкоўваць сацыялістычную сьвядомасьць шырокіх мас. Гэтыя задачы вынікаюць палітычнага значэньня патрабуюць штодзённай упартай працы. Як вядома, нашы клясавыя ворагі, бачачы сваю няўхільную гібель, не ганьбуюць ніякімі мэтадамі і ў першую чаргу шырока выкарыстоўваюць рэшткі нашага невуцтва і некультурнасьці. Гэтымі днямі, будучы на Віцебшчыне, у Чашніцкім раёне мне асабіста прыходзілася наглядаць, як кулачво сваю работу галоўным чынам вядзе на спрытным скарыстаньні нашай некультурнасьці. Чашніцкі раён не выключэньне. Вораг нідзе ні на хвіліну не дрэмле. Вось чаму барацьба за зьніжэньне рэшткаў нашай некультурнасьці ёсьць неабходная ўмова пасьпяховай барацьбы за зьнішчэньне карэньняў капіталізму і пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва. Сваю работу вы зможаце выканаць толькі пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, ні на крок не адступаючы ад яе генэральнай лініі ў барацьбе з нашымі супраціўнікамі і рашуча праводзячы ленінскую нацыянальную палітыку. Толькі ў штодзённай упартай барацьбе мы дасягнем сваёй мэты. Няхай кожны з вас ніколі не забывае слоў нашага любімага правадыра т. Сталіна, што «Наша прасоўваньне адбываецца ў парадку барацьбы, у парадку разьвіцьця супярэчнасьцяй, у парадку перамогі гэтых супярэчнасьцяй... Заўжды ў нас што-небудзь адмірае ў жыцьці. Але тое, што адмірае, ня хоча памірацца проста, а змагаецца за сваё існаваньне, абараняе свае аджыўшыя дні. Заўжды ў нас нараджаецца што-небудзь новае ў жыцьці. Але тое, што нараджаецца, нараджаецца ня проста, а пішчыць, крычыць, абараняе сваё права на існаваньне... Барацьба паміж старым і новым, паміж адміраючым і нараджаючымся—вось аснова нашага разьвіцьця».

Прэзыдэнт Беларускай Акадэміі Навук
П. Горын.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

Плавучы камбайн

ЛЕНІНГРАД. Сьлёсар Ленінградзкага лесасплаву тав. Кузьняцоў выпайшоў плавучы камбайн. Камбайн у адзін і той-жа час выгружае драўніну з вады, разьдзяляе на часткі, акарае, сушыць, коле і грузіць на баржы. Сэзонная магутнасьць камбайну роўна 468 тыс. плытных кбм. Выпаходзтва тав. Кузьняцова зробіць тэхнічны пераварот на лесасплаўных работах. Ужываньне вынаходзтва павінна з'эканоміць за сэзон 2.400 рабочых, што ў лічбасным азначэньні дае 1.370 тыс. руб.

Першы савецкі ільнакамбайн

ЛЕНІНГРАД. Пскоўскі завод «Мэталіст» выпусьціў першы савецкі ільнакамбайн які ачэсвае галоўкі ільну, абмалочвае і сартуе іх, мэханізуе найбольш працаёмкія работы. За 8 гадзін работы камбайн апрацоўвае ўраджай з 25 га.

Будматар'ялы

Рагачоўскі лесазавод імя Халтурына за 22 ліпеня расьпілаваў 344 кбм. бярвеньняў, што складае 111,8 проц. дзённага плану.

***

На лесазаводзе «Спартак» 16 ліпеня расьпілавана 113 кбм. драўніны — 128 проц. дзённай праграмы, 17-га — 55 кбм. — 62 проц. і 18-га — 60 кбм. — 68 проц.

***

Завод **«Чырвоны Кастрычнік»** за 21 ліпеня дзённае заданьне выканаў на 180,5 проц., выпусьціў — 9,3 тон будаўнічых цьвікоў.

***

За чацьвертую пяцідзеўку ліпеня на заводзе «Інтэрнацыянал» выраблена 2.993 скрыні цьвікоў, вагой па 20 кгр. кожная, што складае 93 проц. заданьня пяцідзеўкі, і 2,6 тон вінтоў — 65,7 проц.

Папера

Добруская фабрыка **«Герой працы»** 20 ліпеня выпрацавала 55,7 тон паперы, што дае 57,9 проц. праграмы на дзень, і 22-га — 28,6 тон — 29,6 проц.

***

Фабрыка **«Чырвоная зорка»** 20 ліпеня выканала дзённы плян на 51,6 проц., выпрацавала паперы 20,6 тон і 21-га — 22,1 тоны, або 55,5 проц.

***

На фабрыцы «Спартак» за 21 ліпеня выраблена 16,7 тон паперы — 87,4 проц. дзённага заданьня.

Шырспажыў

Мэблевым цэхам камбінату **«Камінтэрн»** 21 ліпеня зроблена 242 вэнскіх крослаў — 57,6 проц. дзённага плану і 7.645 шавецкіх капылюў — 115,4 проц.

***

За час з 1 па 20 ліпеня **Менская футравая фабрыка «1-га мая»** выпусьціла 15.793 мужчынскіх каўняроў, 2 жаночыя пульты з футравым верхам, 8 мужчынскіх куртак, 2.828 футравых шапак, 1842 куртак з футравым нізам, 93 цэлагрэйкі, 346 пар рукавіц і 100 дзіцячых футравых каўняроў. Двухдзённы плян па фабрыцы выкапан на 110,7 проц.

***

Рымарна - сядзельная фабрыка (Магілеў) плян ліпеня за другую дэкаду выканала на 22,5 проц. Выпушчана 4.293 хамуты, 1.945 сядзёлак, 2.300 шт. шлей, 45 вяровачных і 848 цяёмачных лейцаў, 3.594 гужоў і 464 пары клешчаў для хамутоў.

Становішча ў правінцыі Жэхэ напружанае

МУКДЭН, 24. Становішча ў правінцыі Жэхэ працягвае заставацца прадметам усеагульнай зацікаўленасьці. Наогул праблема правінцыі Жэхэ ў яе цяперашняй фазе нагадвае адпаведны пэрыяд ў становішчы раёну Цзіньчжоў (раён на поўдні мукдэнскай правінцыі) перад уключэньнем яго ў склад манчжурскай дзяржавы. У сапраўднасьці зараз пачынаецца палітычная кампанія, якая суправаджаецца невялікімі ваеннымі сутычкамі і разьлічана, як у пачатку кампаніі па захват Цзіньчжоў, на тое, што Жэхэ далучаецца да Манчжурыі мірным шляхам, не выклікаючы неабходнасьці ваенных дзеяньняў.

За апошні час у японскай прэсе становіцца частымі паведамленьні аб тым, што многія раёны правінцыі Жэхэ нібыта просяць манчжурскую дзяржаву ўключыць іх у свае межы. Гэтыя паведамленьні чаргуюцца з паведамленьнямі аб канцэнтрацыі вялікіх чжан-сюэляўскіх часьцей ля межаў правінцыі Жэхэ і правінцыі Хобей.

Барацьба бэльгійскіх гарнякоў абвастраецца

Бастуюць усе вугальныя басэйны

ПАРЫЖ, 23 (ТАСС). Як паведамляюць з Брусэля, **забастоўка ў Бэльгіі, наперакор усім манэўрам сацыялістаў, працягваецца поўнасьцю ва ўсіх вугальных басэйнах.** Друк канстатуе **пашырэньне забастовачнага руху ў мэталюргічнай і інш. галінах прамысловасьці** і адзначае факт працягваньня барацьбы наперакор пастановам рэфармісцкіх «правадыроў».

Учора сабралася спэцыяльная мяшаная камісія для вывучэньня пытаньняў аб даўжыні рабочага дня і аб разьмеркаваньні работ па капальнях. Міністар працы прапанаваў правесьці анкету сярод прамыслоўцаў. Дэлегаты прадпрыемцаў заявілі, што яны адмаўляюцца прыняць удзел у работах камісіі да таго часу, пакуль ня будзе адноўлена работа ў вугальнай прамысловасьці.

Бэльгійскі друк падкрэсьлівае значэньне забастовачнага руху ў басэйне Лімбургу указваючы, што фламандзкія гарнякі, якія дагэтуль знаходзіліся выключна пад уплывам клерыкалаў, зараз жорстка змагаюцца супроць жабрацкіх умоў працы.

Паліцэйскія рэпрэсіі супроць бастуючых рабочых носяць у гэтым басэйне асабліва жорсткі характар. Жандары прабуюць сілай прымусіць гарнякоў прыступіць да работы, арыштоўваюць і б'юць рабочых. У Жанке (вугальны басэйн Лімбург) арыштавана група забастоўшчыкаў. У Беранжане жандары прышлі да бастуючых вуглякопаў дамоў і загадалі ім вярнуцца на працу.

Кампартыя заклікае бэльгійскіх гарнякоў змагацца да перамогі

ПАРЫЖ, 24. З Брусэлю паведамляюць, што ва ўсіх вугальных раёнах становіцца больш частымі сутычкі паміж бастуючымі рабочымі і жандармэрыяй. У Сэрэне бастуючыя рабочыя адмовіліся вярнуцца на работу і накідалі дэманстрацыю. Паліцыі і жандармерыі ледзь удалося расьсеяць дэманстрантаў. У раёне Шарлеруа адбыліся сутычкі паміж жандармэрыяй і пікетчыкамі. У Лімбургу бастуючыя напалі на машыну, якая развозіла штрэйкброхэраў, зьбілі іх і спалілі машыну.

Як паведамляе бэльгійская «Пэпль», пераважная большасьць у мясцовых прафсаюзных арганізацыях гарнякоў пастанавіла працягваць забастоўку. З прычыны адмаўленьня прадпрыемцаў весьці перагаворы пакуль не адноўлена работа, рэфармісты запрапанавалі правесьці сярод гарнякоў рэфэрэндум па пытаньні аб спыненьні забастоўкі.

У процівагу гэтай прапанове, **бэльгійская кампартыя заклікае бэльгійскіх рабочых стварыць забастовачныя камітэты, якія былі-б выбраны ўсімі бастуючымі узмацніць пікетаваньне капальняў і працягваць барацьбу за свае патрабаваньні. У Льежы і Эрэз праведены арышты сярод камуністаў.**

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ ТАСС

Падпісаньне савецка-польскага дагавору аб ненападзе

25 ліпеня паміж Народным Камісарам па замежных справах тав. М. М. Кросьцінскім і пасланьнікам польскай рэспублікі п. Патэкам у памяшканьні НК Замежных Спраў падпісан акт парафіраванага 25 студзеня г. г. і апублікаванага 26 студзеня дагавору аб ненападзе паміж СССР і Польшчай.

Пры падпісаньні прысутнічалі: загадчык першага Зах. аддзелу НК замежных спраў тав. Райтэр, загадчык прававога аддзелу тав. Сабанін і адказны супрацоўнік НК замежных спраў.

Ад польскай стараны прысутнічалі дарадцы польскай місіі Карпо, Сядзеўскі і Сакольніцы.

Новаму ўраджаю—бальшавіцкую сустрэчу

(На усебеларускай нарадзе па збожжазагатоўках)

Падрыхтоўка да збожжазагатоўчай кампаніі бягучага году ўсё яшчэ праходзіць незадавальняюча. Некаторыя раённыя арганізацыі і асабліва сыстэмы Белзагатзярно працяўляюць апартуністычную бязьдзейнасьць, топчуцца на адным месцы. Не адчуваецца сапраўднай баявой работы па арганізацыі сустрэчы новага ўраджаю.

Гэта з ўсёй відавочнасьцю выявілася на нарадзе работнікаў збожжазагатоўчых арганізацый.

Нам. упаўнаважанага камітэту па загатоўках пры СПА **тав. Красоўскі** ў сваім дакладзе даў практычную праграму работы загатоўцаў па рэалізацыі дырэктыў партыі і ўраду аб выкананьні збожжазагатоўчага плану.

Як вядома, у 1932 годзе плян збожжазагатовак па калгасах і аднаасобным сэктары скарочан.

Перад усімі раённымі і вясковымі арганізацыямі стаіць задача — **забясьпечыць выкананьне ўсяго даяркаўнага пляну ў найкарацейшы тэрмін.**

Трэба так арганізаваць работу, каб уникнуць буйнейшых памылак і недахопаў збожжазагатоўчай кампаніі мінулага году і дабіцца своячасовай і поўнай рэалізацыі пляну.

Значную ролю адыгрывае тут плянаваньне. Пры ўстанаўленьні плянаў загатовак збожжа неабходна дакладна ўлічыць фактычныя пасеўныя плошчы данай гаспадаркі і ўраджайнасьць да моманту вызначэньня пляну.

Трэба павесьці рашучую барацьбу супроць механічнага плянаваньня, ураўнілаўкі і г. д. Асабліва важна ўстанаўленьне пляну па асобных культурах у дакладнай адпаведнасьці з ураджайнасьцю, пасеўнымі плошчамі і валавым зборам па кожнай данай культуры.

Работа павінна быць праведзена так, каб устанаўленьне пляну загатовак збожжа па асобных калгасах і вёсках закончыць па працягу 10 дзён з часу дасылкі раённага пляну.

Праводзячы работу па загатоўках збожжа, трэба ня менш увагі аддаць і выкананьню пляну намольнага збору. Нельга дапусьціць паўтарэньня згубных фактаў разбазарваньня гарнца, якія мелі месца ў мінулым годзе.

Задача ўсіх загатоўчых арганізацый — неадкладна пераглядзець свой штат, ачысьціць яго ад чужых і клясава-варожых элементаў і ўзмацніць апарат камсамольцамі, вясковымі актывістамі, лепшымі ўдарнікамі-калгаснікамі.

Некалькі слоў аб разьліку. У адрозьненьне ад практыкі мінулага году, разьлік за зданае збожжа даяржаве будзе праводзіцца на месцах пры здачы збожжа безадкладна.

Арганізацыйная перабудова загатоўчага апарату мае вялікае значэньне для пасьпяховага правядзеньня загатовак збожжа. Апарат павінен быць пабудаван так, каб забясьпечыць пасьпяховае выкананьне пляну. Захоўваецца жорсткая цэнтралізацыя ў справе распараджэньня збожжавымі рэсурсамі. Для гэтай мэты па БССР арганізавана 18 міжраённых баз. Толькі па іх нарадах раённая база зможа выдаць збожжа.

Дакладчык асабліва падрабязна спыніўся **на пытаньнях падрыхтоўкі тэхнічнай базы, арганізацыі культурна - масавай работы на загатпунктах, разгортваньня калгаснага гандлю.**

Выкананьне цэнтралізаванага пляну загатовак збожжа — першачарговы абавязак калгасаў, МТС і працоўных аднаасобнікаў. Гэты лёзунг павінен быць зазыцыёўлен на справе ўсіні калгаснікамі і працоўнымі аднаасобнікамі.

Надыходзячая загатоўчая кампанія патрабуе канкрэтнага апэрацыйнага кіраўніцтва, разгортваньня агітацыйна - масавай работы, мабілізацыі ўсіх сіл партыйных, камсамольскіх, савецкіх, прафсаюзных і калгасных арганізацый.

Д.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

28-VII—г. т., у 6 гадзін вечара, у памяшканьні Менгаркому КП(б)Б (Карла Маркса, 14 2-гі паверх, заля пасяджэньняў, пакой № 32)

адбудзецца

ПА-ЗАЧАРГОВЫ ПАШЫРАНЫ ПЛЕНУМ Мен. гарКК КП(б)Б—РСІ

з сумесна з актывам РСІ (члены і кандыдаты КП(б)Б)

парадкам дня:

Аб чэрговых задачах КК-РСІ.

На пленум апрача членаў гарКК павінны зьявіцца: 1) сакратары п/к і калектываў ЛКСМБ (члены і кандыдаты партыі) наступных прадпрыемстваў: зав. „Бальшавік", зав. імя Варашылава, зав. „Камунар", зав. імя Молатава, ф-ка „Кастрычнік", абутковая ф-ка, хлебазавод, друкарня імя Сталіна, „Ударнік", „Полымя Рэвалюцыі", пічотачная ф-ка, цягі, 2) парт. засядацелі, 3) грамадзкія інспэктары (члены і канд. партыі), 4) рэдактары шматтыражак і насьпенгазэт (члены і канд. партыі), 5) рабочыя засядацелі (члены і канд. партыі), 6) начальнікі пастоў РСІ (чл. і канд. партыі), 7) старшыні ЗРК і рэўкамісіі (чл. і канд. партыі). 8) старшыні сэкцый РСІ Гарсавету (чл. і канд. партыі), 9) члены парткалегіі, 10) начальнікі „ЛК" (члены і канд. партыі).

Яўка ўсіх вышэйпамянёных абавязкова і без спазьненьня.

„ГОРТ" Москва, Москворецкая, 26

ПАСЫЛКА—ПОШТАЙ ХУТКАЙ АКУРАТНАЙ

МАЦУЙ АБАРОНУ СССР

Да ўвагі школ, гурткоў, ленкуткоў, вайсковых часьцей і ДЧА

Дыяпазытывы на шкле па абароне краіны і вайсковай справы.

	Цена
Планеризм	16. —
Авиация и авиационная работа ОАХ	16. —
Дирижаблестроение	25—20
Для чего нам нужны дирижабли	16. —
Основные задачи Осоавиахима	16. —
Осоавиахим—опора мирного труда и обороны СССР	16—10
Пионер за рабочее дело будь готов	16. —
Комсомол, крепи оборону СССР	16. —
Допризывник, готовься стать квалифицированным бойцом Красной армии	16. —
Заводы и фабрики — крепости обороны	16. —
Женщина и оборона СССР	16. —
Станковый пулемет „Максим"	18. —
Задержки пулемета „Максима"	12—40
Что нужно знать по противовоздушной обороне	16. —
Как защищать себя от отравляющих веществ	16. —
Боевой путь Красной армии	27.—80
Из жизни Красной армии	17. —
Красный флот	16. —
Подготовка вооруженных сил рабочих и Октябрь 1917 г.	16—80
Революционная и боевая деятельность т. Ворошилова	14. —
Физкультура и спорт	16—60
1-я Конная Красная армия	17—50
Соцстроительство и Красная армия	16. —
Красная армия на страже Советов	21. —
Гиганты воздушн. техники	20. —
Как рабочие и крестьяне завоевали власть в Октябре	18—80

Ёсьць дыяпазытывы па пытаньнях навукі і тэхнікі, грамадазнаўства, сельскай гаспадарцы, прыродазнаўстве і інш. (да кожнай сэрыі дыяпазытываў прыкладзена брашура або сюжэтны ліст у дапамогу лектару). ПАТРАБУЙЦЕ КАТАЛЁГІ ДАРМОВА.

ЁСЬЦЬ У ПРОДАЖЫ АПАРАТУРА: праекцыйны ліхтар з усімі прыладамі для мясцовасьцей з электрасеткай 100-20. Праекцыйны ліхтар з усімі прыладамі для мясцовасьцей без электрасеткі 127-70. Эпідыяскоп 150. Мікраапарат 200. Экран разьмерам 150X175 с. м. 37. Заказы выконваюцца выключна пры атрыманьні задатку ў разьмеры 50 проц.

ГРОШЫ І ЗАКАЗЫ НАКІРОЎВАЦЬ:

„Москва, Москворецкая, 26, сектор наглядных пособий ГОРТ'а".

Народны Камісарыят Працы сумесна з ЦСПСБ і Народным Камісарыятам Аховы Здароўя

склікае на 28-30 ліпеня 1932 г.

1-ы Усебеларускі зьезд па тэхніцы бясьпекі і санітарнай тэхніцы

з наступным парадкам дня:

1. Барацьба) з траўматызмам (даклад НКПБ і інстытуту аэд. і арг. працы.
2. Барацьба з захворваньнем (даклад інстытуту РККС і НКАЗ).
3. Санітарнае становішча прадпрыемстваў (даклад НКПВ, інстытуту і НКАЗ).

Выдучаныя дэлегаты на зьезд могуць атрымаць мандаты ў НКПБ (Чырвонаармейская 16, 2-гі паверх пам. 19) 27-га ліпеня ад 12 гадз. дня да 7 гадз. вечара і 28-га ліпеня ад 10 г. раніцы да 4 г. дня.

Запрашальныя білеты рассылаюцца па прадпрыемствах.

АРГКАМІСІЯ.

КІНО „СПАРТАК" ПРАЕКТ ІНЖЫНЭРА СТРОНГА

Чыр. Зорка Пач.: 6, 7-30, 9, 10-30, Каса—з 4 г. — Мастацкі гістарычны фільм Камэдыянтка Драма ў 6 част. Звыш праграм.—хроніка Саюзкіно

„Інтэрнацыянал" — Гэрольд Лёйд у амэрыкан. камэдыі Баязьлівасьць да жанчын Звыш праграм. хроніка Саюзкіно.

Кіно „Пралетары" — Мастацкі фільм СЭВІЛЬ Звыш праграм. хроніка Саюзкіно. Дзённыя дзіцячыя сэансы Баспрытульны спартсмэн Звыш праграм. хроніка Саюзкіно.

Летні тэатр саду „Прафінтэрн" Ад 26 ліпеня зусім абноўленая праграма 4-га цыклю эстрадна-цырковых паказаў МЮЗІК-ХОЛ у 2-х аддзяленьнях, у складзе: зноў гастролі Івана Сьцяпанавіча Гурно (тэатралізаваная апавесьць „Зімняя кліча"), Ніжнялівскае (новы фальсьпевы). Персіяніноў (новы фальтон „Я абяцаю вам краіну Саветаў"). Першыя выступленьні Халмагорава і Вісільлева (характарныя танцы). 3—РУГЕН —3 (партэрныя акробаты). 2— РЫНШ —2 (паветраны акт). Першыя выступленьні Міры Арэнаўны Ліфшыц (солё-скэтч на яўрэйскай мове „Сэньялны портрэты"). Даніляўсні (арыі з опер „Тоска", „Афрыканка", „Аіда"). Шварц і Сенеў (татарскі і мад'ярскі танцы). 3— ЯШЫНЫ —3 (эквілібрыдысты). 4— ФЭРОНІ —4 (музычныя экстрадысты). (трыкі).

Ля раяля Таснін, Канфэрансье В. В. Наймоўсні.

Сымфанічны аркестр пад кіраўніцтвам Рыбакова суправаджае праграму і грае ў антрактах.

Прымаюцца заўчы на мэтавы пастаноўкі і культпаходы. Дзеці да 16 год не прапускаюцца.

Білеты прадаюцца штодзённа ў рабочай касе з 12 да 2 і з 4 да 6 г. вечч., у дзень паставоўкі—у касе тэатру з 7 гадз. вечч.

АНОНС!

СКОРА ЎСЕ ЗНОЎ БУДУЦЬ ГЛЯДЗЕЦЬ І СЛУХАЦЬ

ЛКШНЫ ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ

ПУЦЁЎКА Ў ЖЫЦЬЦЁ

Школа ФЗВ мэталістаў

пры заводзе „Ударнік"

АБВЯШЧАЕ НАБОР ВУЧНЯЎ У СЬЛЕСАРНЫ, ТАКАРНЫ і ФАРМОВАЧНЫ ЦЭХІ.

Прымаюцца скончыўшыя сямігодку. Стыпэндыяльнай забясьпечваюцца, згодна тарыфнай сеткі БМА. Школа забясьпечваецца па 1 сьпісу, 1 катэгорыі. Прыём заяў да 1 жніўня. Заявы падаваць у канцылярыю школы—Вяземская, 5, завод „Ударнік".

Талефоны рэдакцыі: Адказны рэдактар—4-27; сакратарыят—10-74; сэктары: партыйнага будаўніцтва—13-80; эканамічна-прамысловы—13-80; калгасны і сяльгаспрадпрыемства—13-80; вайскова-палітычны—13-80; транспартны—6-19; сацыялістычнага земляробства—6-19; замежнай інфармацыі—6-19; сэктар ударных брыгад—6-19; лістоў рабочых і калгаснікаў—6-19; культурнага будаўніцтва—6-19, агляду друку—6-19; бібліяграфія—6-19; бюро расьсьледаваньня—6-19.

Талефоны канторы: Загадчык канторы—7-81: аддзел аб'яў і бухгальтэрыя—7-81.

Адрас рэдакцыі: Менск, Савецкая, 63.

Галоўлітбел № 337.

Менск, друкарня «Зьвязда».